ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**Uzari, музыкант у трэцім пакаленні, спрабуе сябе адначасова ў іпастасях кампазітара, аранжыроўшчыка і акцёра, але застаецца ў душы філосафам...**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр**

***«Цяпер, ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу, займацца рэфармаваннем адносін уласнасці небяспечна. Можа быць, я скажу непапулярную рэч, але такую маштабную мадэрнізацыю ўсёй народнай гаспадаркі ў сціснутыя тэрміны можна ажыццявіць толькі дзякуючы падтрымцы дзяржавы, пад жорсткім дзяржаўным кантролем і кіраваннем».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | –7° |
| Віцебск | –11° |
| Гомель | –11° |
| Гродна | –7° |
| Магілёў | –11° |
| Мінск | –10° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8550,00 | ▼ |
| Еўра | 11320,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1055,43 | ▼ |

КОРАТКА

У Пекіне 19 снежня падпісаны крэдытныя пагадненні з Экспартна-імпартным банкам Кітая аб прадастаўленні льготных пакупніцкіх крэдытаў для рэалізацыі ў Беларусі двух інвестыцыйных праектаў. Адзін з гэтых інвестыцыйных праектаў накіраваны на стварэнне нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання Беларусі, другі — на рэканструкцыю аўтамабільнай дарогі М5/Е271 Мінск—Гомель на ўчастку Бабруйск—Жлобін.

Паводле прагнозаў, у 2013 годзе глабальная эканоміка вырасце на 2,4 працэнта, а ў 2014 годзе — на 3,2 працэнта. Пры гэтым зона еўра — ужо ў рэцэсіі. Беспрацоўе ў зоне еўра дасягнула рэкорднага ўзроўню — 12 працэнтаў. Чакаецца, што тэмпы эканамічнага росту ЗША ў 2013 годзе застануцца на ўзроўні 1,7 працэнта.

На 14 снежня пытанне аб прымяненні амністыі разгледжана ў дачыненні да 14 тыс. 807 асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі (усяго падпадаюць пад амністыю 15 тыс. 126 чалавек).

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 СНЕЖНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 245 (27360) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ДЛЯ ПАГЛЫБЛЕННЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА АДКБ З МІЖНАРОДНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ЁСЦЬ ДОБРЫ ПАТЭНЦЫЯЛ»

**Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы неабходна паглыбляць супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, у прыватнасці з АБСЕ, НАТА. Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі на пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, якое прайшло ўчора ў Маскве, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што для паглыблення супрацоўніцтва АДКБ з міжнароднымі арганізацыямі ёсць добры патэнцыял. Паводле слоў Прэзідэнта, па-першае, гэта датычыцца аптымізацыі ўзаемадзеяння з АБСЕ па тых напрамках, дзе набыты сур'ёзны вопыт у абедзвюх структурах. Па-другое, неабходна развіваць сувязі для ўдзелу ў міратворчых кампаніях пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «Гэта тая ніша, якая цяпер найбольш актуальная, аднак тут мы яшчэ знаходзімся ў самым пачатку шляху», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён лічыць, што АДКБ ужо ў бліжэйшым будучым трэба падключыцца хаця б да адной місіі ААН. На яго думку, гэта не толькі ўмацуе ўзаемнае супрацоўніцтва, але і дасць бясцэнны вопыт правядзення сумесных аперацый па падтрыманні міру.

Трэцяй структурай, узаемадзеянне з якой неабходна развіваць, з'яўляецца НАТА. «Нават з НАТА, якая быццам бы не заўважае існавання нашай арганізацыі, ёсць магчымасць для развіцця дыялогу. Агульнавядома, што, нягледзячы на дэманстратыўную непрыязнасць, эксперты і аналітыкі альянсу пільна сочаць за нашай арганізацыяй, праводзімымі вучэннямі і іншай практычнай дзейнасцю АДКБ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Мы павінны не раз за разам заклікаць натаўцаў да супрацоўніцтва, а на практыцы дэманстраваць ім, што альтэрнатывы наладжванню прагма практычнага ўзаемадзеяння з АДКБ сёння няма», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. «Не павінна быць канкурэнцыі і дублявання намаганняў у забеспячэнні бяспекі еўразійскага рэгіёну», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

СТАР. 2

■ Садружнасць

## РАСІЯ РАЗГЛЯДАЕ БЕЛАРУСЬ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНАГА ПАРТНЁРА

**Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр СУРЫКАЎ.**

### ПАЛІТЫКА, ЭКАНОМІКА І ЎНІКАЛЬНЫ ДОСВЕД

«Свой першы візіт у якасці прэзідэнта Уладзімір Пуцін здзейсніў не ў якую іншую краіну, а ў Беларусь, — нагадаў ён. — Гэта відавочна пацвярджае, што Беларусь з'яўляецца прыярытэтнай для Расіі. Усе чатыры галоўныя дзяржаўныя персоны — прэзідэнт, прэм'ер, кіраўнікі абедзвюх палат парламента пабывалі з візітамі ў Беларусі ў 2012 годзе. Такой гушчыні візітаў высокіх асоб Расіі не ажыццяўлялася сёлета ні ў адну іншую краіну свету».

Пасол адзначыў, што ў 2012 годзе споўнілася 20 гадоў усталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Расіі. Абедзве краіны ў зыходзячым годзе ўмацоўвалі сваю дзяржаўнасць і пераадолелі шматлікія цяжкасці, сказаў ён. На добрым узроўні знаходзіцца ваеннае супрацоўніцтва, захоўваецца агульнасць у знешнепалітычных падыходах, а ўнікальны досвед будаўніцтва саюзнай дзяржавы трэба выкарыстоўваць пры пабудове Мытнага саюза, лічыць Сурыкаў.

СТАР. 2

■ Свае сярод сваіх

## МЫ — У СЯБЕ ДОМА

**Ірына і Дзяніс Клімковы з трыма дзецьмі пераехалі з Феадосіі ў беларускую глыбінку. Сям'я рыхтуецца сустрэць свой першы беларускі Новы год у доме ў вёсцы Гарадзец Быхаўскага раёна, які ўжо аздоблены navaгоднімі цацкамі.**

Ірына і Дзяніс некалькі гадоў таму прыехалі ў Беларусь з Крыма.

— Бацька мужа адсюль родам, Дзяніс вучыўся ў школе, і яго цягнула на радзіму, — проста расказвае гісторыю «вялікага перасялення» сваёй сям'і Ірына. — Ён угаворваў мяне пераехаць у Беларусь. І ўрэшце я пагадзілася.

Клімковы — людзі маладыя, таму паехалі не прыглядацца, а адразу з усімі рэчамі, на пастаяннае месца жыхарства. Можа, на словах гэта падасца надта рашучым учынкам, тым больш для бацькоў малых дзяцей. Але дастаткова пабачыць гэтую пару на свае вочы, каб зразумець: яны шчыра кахаюць адно аднаго, вельмі любяць сваіх дзяцей, і ім будзе добра тут.

Ірына і Дзяніс пазнаёміліся ў краме тэхнікі, дзе яна была дырэктарам, а ён прыйшоў наймацца прадаўцом. Яна цяпер узгадвае (з задавальненнем), як нешта тлумачыла маладому работніку, а ён глядзеў на начальніцу ва ўсе вочы — «вылупіўся», як сказала Ірына. Дзяніс, тым не менш, вучыўся хутка і праз лічаныя месяцы стаў лепшым прадаўцом... і кіраўніком іншай крамы. «А потым у нас нарадзіўся Даніла», — усміхаецца Ірына.

СТАР. 3

■ На экранах

## «ОЙ, МА-МА-ЧКІ!»... БЕЛАРУСКАЕ КІНО!

### Узнагарод прыбавілася, пытанні засталіся

**Вынікі 2012 года для кінагаліны нашай краіны, істотную частку якой па розных гістарычных прычынах займае Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», даволі суцяшальныя. Знікненне манаполіі кінастудыі на дзяржаўнае фінансаванне, перамогі на прэстыжных кінафестывалях, пераход на акупнасць і лічбавыя тэхналогіі. Гэта — калі сцісла.**

У цэлым кінастудыя «Беларусьфільм» працавала сёлета амаль над 150 кінапраектамі. Лічба сапраўды ўражвае. Але з іх у стадыі вытворчасці знаходзілася трохі больш за 90. У першым адкрытым конкурсе, які праводзіўся Міністэрствам культуры і ў якім маглі ўдзельнічаць усе кінакампаніі Беларусі незалежна ад формы ўласнасці, «Беларусьфільм» падаў 25 заявак. З іх 17 (6 гульнявых, 5 дакументальных, 6 анімацыйных) прайшлі адбор і атрымалі магчымасць частковага фінансавання дзяржавай (да 70% у залежнасці ад характару стужкі).

СТАР. 4

**Кіраўніцтву, асабоваму складу, ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь**

***Паважаныя таварышы!***

*Віншую вас з прафесійным святам — Днём супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі.*

*З'яўляючыся пераемніцай ВЧК-КДБ, беларуская спецслужба за 95 гадоў свайго існавання прайшла доўгі шлях станаўлення і развіцця, увабрала ў сябе ўсе лепшыя традыцыі старэйшых пакаленняў чэкістаў, галоўная з якіх — самаадданае служэнне Айчыне.*

*Сёння Камітэт дзяржаўнай бяспекі на высокім прафесійным узроўні вырашае задачы, якія стаяць перад ім, служыць надзейным шчытом Беларусі ад унутраных і знешніх пагроз, уносіць значны ўклад у забеспячэнне суверэнітэту і недатыкальнасці нашай краіны.*

*Асаблівыя віншаванні — ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі. Вы сталі прыкладам мужнасці, сапраўднага патрыятызму і грамадзянскай адказнасці. А ваш вопыт і мудрасць натхняюць маладых супрацоўнікаў.*

*Упэўнены, асабовы склад органаў дзяржаўнай бяспекі і ў далейшым будзе канкрэтнымі справамі даказваць вернасць службоваму доўгу, надзейна стаяць на ахове нацыянальных інтарэсаў нашай Радзімы.*

*Жадаю вам здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у працы на карысць Беларусі.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# «ДЛЯ ПАГЛЫБЛЕННЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА АДКБ З МІЖНАРОДНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ЁСЦЬ ДОБРЫ ПАТЭНЦЫЯЛ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У той жа час Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) напярэдзе няпросты перыяд. «На жаль, мы канстатуем, што канфліктны патэнцыял у міжнародных адносінах па-ранейшаму нарастае. Гэтаму садзейнічае шэраг аб'ектыўных фактараў, такіх як эскалацыя насілля на Блізкім Усходзе, абвастрэнне міждзяржаўных супярэчнасцяў у энергетычнай сферы. Акрамя таго, адбыўся перакос існуючай сістэмы міжнароднай бяспекі з-за імкнення асобных дзяржаў адыгрываць у ёй вядучую ролю без уліку інтарэсаў іншых», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле яго слоў, як вынік — захавана практыка аказання эканамічнага і палітычнага націску на суверэнныя краіны. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што не апошнюю ролю ў сітуацыі, што склалася, адыгрывае дэградацыя дзеючай сістэмы кантролю над звычайнымі ўзбраеннямі ў Еўропе, у выніку чаго назіраецца з'яўленне прыкмет развязвання новай гонкі ўзбраенняў.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што для АДКБ асабліва адчувальным з'яўляецца пытанне абароны ад пагроз, што ідуць з Афганістана. «Такім чынам, ускладзеная на АДБК місія забеспячэння нацыянальнай калектыўнай бяспекі, а таксама каардынацыі знешнепалітычных пазіцый па міжнародных рэгіянальных пытаннях цяпер запатрабавана як ніколі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. «У цэлым мы задаволены работай гэтых механізмаў узаемадзеяння», — сказаў ён, у той жа час дадаўшы, што калектыўныя ўказанні маюць патрэбу ў адаптацыі да сучасных выклікаў і пагроз.

Прэзідэнты краін АДКБ прынялі рашэнне аб стварэнні Калектыўных сіл Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. У Калектыўныя сілы АДКБ будуць аб'яднаны ўсе ваенныя структуры, створаныя раней у арганізацыі. У іх ліку Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання, міратворчыя сілы, а таксама розныя двухбаковыя воінскія кантынгенты.

Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў прынялі рашэнне аб стварэнні Калектыўных сіл рэагавання на надзвычайныя сітуацыі. Плануецца, што гэтыя сілы змогуць аператыўна аказваць дапамогу любому члену арганізацыі ў выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый прыроднага або тэхнагеннага характару.

«У цэлым гэта была адна з самых удачных і эфектыўных сесій Савета калектыўнай бяспекі АДКБ», — рэзюмаваў генеральны сакратар арганізацыі Мікалай Бардзюжа.

На сесіі старшынства ў АДКБ перайшло ад Казахстана да Кыргызстана.

# РАДЫКАЛЬНАЙ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ЕЎРАЗЭС ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ

**Радыкальнай рэарганізацыі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва пакуль не будзе. Гэта пытанне абмяркоўвалася ўчора на пасяджэнні Міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС у Маскве, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, размова ішла аб Сакратарыяце Інтэграцыйнага камітэта ЕўрАзЭС. Кіраўнік беларускай дзяржавы нагадаў, што калісьці была дасягнута дамоўленасць, што Інтэграцыйны камітэт ЕўрАзЭС не патрэбны, паколькі ёсць Еўразійская эканамічная камісія. «Гэта камісія вырашае ўсе пытанні. І мы прынялі рашэнне аб ліквідацыі структур ЕўрАзЭС. У перагаворным працэсе мы выйшлі на ўзаемапрымальныя рашэнні», — адзначыў Прэзідэнт. «Мы выраслі са штаноў ЕўрАзЭС, ператварыліся ў паспяховую арганізацыю», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што Казахстан прапануе захаваць Сакратарыят Інтэграцыйнага камітэта, скараціць яго колькасць да 22 чалавек за кошт скасавання дэпартаментаў, якія дублююць кампетэнцыю ЕЭК.

«Ад Беларусі нічога не трэба. Просяць толькі не блакіраваць вырашэнне пытанняў. Я сказаў: так і будзе, старэйшыя гавораць — я выконваю. З беларусамі загвіздкі не будзе», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што беларускі бок задавальвае, што ў свой час было сказана аб тым, што ён не ўдзельнічае ў фінансаванні гэтай структуры. Фінансуе Казахстан, дапамагае Расія.

«Нейкі час, напэўна, яна няхай існуе. Мы такое падтрымаем, падпішам», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

# РАСІЯ РАЗГЛЯДАЕ БЕЛАРУСЬ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНАГА ПАРТНЁРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Тавараабарот Беларусі і Расіі па выніках 2012 года складзе прыкладна $42 млрд. Гэта вельмі высокі паказчык, лічыць дыпламат. Для параўнання, тавараабарот Расіі і Кітая складзе $90 млрд. На думку Аляксандра Сурыкава, такія паказчыкі садзейнічаюць павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва дзвюх краін. Так, тэмпы росту рэальных грашовых даходаў насельніцтва Расіі і Беларусі ў прынцыпе супастаўныя — 18 працэнтаў да ўзроўню 2011 года. Аляксандр Сурыкаў назваў адыходзячы год у цэлым пазітыўным у развіцці ўзаемаадносін Расіі і Беларусі

## ГОД НАСТУПНЫ: ДАГАВОРЫ ПРА НАФТУ І ХОЛДЫНГІ

Кажучы пра год надыходзячы, расійскі пасол паведаміў, што пакуль аб'ёмы паставак расійскай нафты ў Беларусь у 2013 годзе не ўзгоднены. «Беларускі бок просіць 23 млн т нафты на будучы год. Мы згаджаемся на тым узроўні, што нам вядомы, — на 18,5 млн т. Дзе канчатковая логіка, мне сказаць складана. Ведаю, што ўнутраныя патрэбнасці Беларусі ацэньваюцца прыкладна ў 7-8 млн т нафты», — адзначыў Аляксандр Сурыкаў.

«Мы разумеем, што бюджэт і прагноз у Беларусі звярстаны, зыходзячы з 23 млн т, і разумеем, што ёсць цяжкасці, — дадаў дыпламат. — Калі нават не ўдасца дамовіцца да канца года, то Расія зробіць усё, каб у рамках тых лічбаў, якія ёсць, загрузіць першы квартал такім чынам, каб беларускія магутнасці цалкам выкарыстоўваліся. Гэта значыць, з 18,5 млн т значную частку паставіць у першым квартале і далей працягваць размову». Аляксандр Сурыкаў патлумачыў, што перамовы па балансе паставак нафты расійскі бок увязвае з вырашэннем шэрагу спрэчных пытанняў і, у прыватнасці з умовамі вяртання ў Расію светлых нафтапрадуктаў. Пытанне балансу паставак нафты, па словах пасла, будзе ўрэгулявана з улікам павелічэння магчымага вяртання на Расію. «Але калі часу не хопіць, то ў першым квартале, пакуль гэта пытанне будзе рэгулявацца, будзе загрузка нафтаперапрацоўчых заводаў», — запэўніў пасол.

На пачатку будучага года чакаецца і стварэнне холдынга «Расбелаўта», перамовы аб якім паміж беларускім МАЗам расійскім КамАЗам блізкія да завяршэння. «Ідзе спакойнае ўтварэнне аб'яднання, якое будзе мець адзіную палітыку збыту. Расійская дзяржкарпарацыя «Растэхналогіі», якая валодае часткай акцый КамАЗа, таксама лічыць перспектыўным стварэнне холдынга з Мінскім заводам колавых цягачоў. Гэтая праца толькі распачатая», — сказаў дыпламат.

## ТРАНЗІТ ГАЗУ БУДЗЕ ПАВЯЛІЧАНЫ

«Газпрам» на працягу 5 бліжэйшых гадоў планує павялічыць транзіт газу праз тэрыторыю Беларусі на 30%, паведаміў Аляксандр Сурыкаў. У планах «Белтрансгаза» і «Газпрама» таксама будаўніцтва Мазырскага падземнага сховішча газу, якое дазволіць у зімовы перыяд забяспечваць пастаўкі газу ў Еўропу па аптовых цэнах, а таксама гарантаваць беспераболйнае забеспячэнне беларускіх спажыўцоў.

Расійскі пасол пацвердзіў, што «Газпрам» не адмаўляецца ад планаў па будаўніцтве ў Мінску новага офіса для «Белтрансгаза» на месцы Маскоўскага аўтавакзала і намераны працягнуць у Беларусі будаўніцтва жылля для работнікаў гэтай кампаніі.

Дыпламат адказаў таксама на пытанне журналістаў аб магчымым пакрыцці страт з боку Беларусі ад паставак разбаўляльнікаў і растваральнікаў. «Гэтая тэма прысутнічае, — сказаў ён, — але няма такога напалу, што было. Як гэта зрабіць? Мы разумеем, што гэта надзвычай складана. Бакі шукаюць падыходы». Расійскі пасол назваў сітуацыю, якая склалася сёлета з экспартам разбаўляльнікаў і растваральнікаў, «крыўднай для Расіі», паколькі ў Федэрацыі ёсць апазіцыйна настроеныя сілы, якія «гэтую тэму могуць вельмі добра абыграць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ■ На слыху

# ВОСЬ ДЫК «ПАЧАСТУНАК» ДА СВЯТОЧНАГА СТАЛА...

**За некалькі дзён аператыўнікамі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі на сталічных рынках было выяўлена і канфіскавана каля 2,5 тоны пратэрмінаваных мясных вырабаў.**

Буйное парушэнне было выяўлена на Камароўскім рынку. Там пры праверцы пяці гандлёвых пунктаў, якія належалі адной і той жа прыватнай арганізацыі, выявіўся факт рэалізацыі звыш 2 тон каўбаснай і мяснай прадукцыі без пацвярджальных дакументаў і канкрэтных розничных цэн. Больш за тое, каля 100 кілаграмаў з названага аб'ёму (а гэта каля 20 асартыментных найменняў) дык і ўвогуле трэба было даўно спісаць для ўтылізацыі: тэрмін прыдатнасці тавару скончыўся яшчэ месяц таму. У выніку ўсю партыю прыблізным коштам 180 мільёнаў рублёў канфіскавалі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПІРАТЭХНІЧНЫ «ЎЛОЎ»

**Канфіскавана піратэхнікі на суму больш за 53,4 мільёна.**

Супрацоўнікамі міліцыі ў памяшканні гандлёвага цэнтра ў райцэнтры Мёры былі выяўлены факт рэалізацыі без сертыфікату якасці вялікай партыі піратэхнічных вырабаў. Канфіскавалі каля 9,9 тысячы адзінак піратэхнікі на суму больш як 23,4 мільёна рублёў.

А ў Браславе ў гандлёвым павільёне прыватнага гандлёвага прадпрыемства канфіскавана 6,2 тысячы адзінак піратэхнічных вырабаў на суму больш як 30 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

## ■ Мы і свет

# ГЭТА — ДАТА!

Шэрагам цікавых, незабыўных мерапрыемстваў адзначана 20-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Дзяржавай Ізраіль і Рэспублікай Беларусь, а таксама стварэння Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадзянскіх аб'яднанняў і абшчын. Сярод іх, гэтых мерапрыемстваў, і цырымонія, прысвечаная памяці нашага земляка першага прэзідэнта Ізраіля Хайма Вейцмана, і шматлікія выставы (у тым ліку Марка Шагала), і фестываль ізраільскага кіно, і вялікі ханукальны канцэрт, і Дні культуры...

Днямі ў памяшканні Нацыянальнага мастацкага музея краіны адбылося заключнае мерапрыемства — урачыстая прэзентацыя паштовага блока. Створаны выдавецкім цэнтрам «Марка» Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта», ён выйшаў у свет (у самым шырокім сэнсе гэтага слова) з лёгкай рукі (на здымку) пасла Ізраіля ў Беларусі Іосіфа Шагала, міністра сувязі і інфарматызацыі нашай краіны Мікалая Панцялея і начальніка Упраўлення краін Азіі і Афрыкі Міністэрства замежных спраў Беларусі Ігара Ляшчэні.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

**Алесь ЖОХ**

■


Открытое акционерное общество «Технобанк» (место нахождения: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44) настоящим уведомляет акционеров ОАО «Технобанк» о принятии внеочередным Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 12.12.2012 (протокол № 9), решения о внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк» и о праве акционеров требовать выкупа акций при условии, что они голосовали против принятия решения о внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк» или не участвовали в Общем Собрании акционеров ОАО «Технобанк» от 12.12.2012, на котором было принято данное решение. Для реализации своего права требовать выкупа акций акционеру необходимо представить в письменном виде в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 соответствующее заявление произвольной формы на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» в течение 30 дней со дня проведения Общего Собрания акционеров, на котором было принято решение, повлекшее возникновение права требовать выкупа акций (12.12.2012). ОАО «Технобанк» по результатам рассмотрения поданных заявлений с требованиями о выкупе акций в течение 70 дней с даты поступления заявления в банк удовлетворяет требования акционеров либо в течение 30 дней сообщает акционерам об отказе в удовлетворении требований акционеров.

Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь
на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562.



04 января 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность). С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 26.12.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

■ Падрабязнасці

# СІТУАЦЫЯ БЫЛА КРЫТЫЧНАЙ

**Наступствы аварыі на трубаправодзе ў Гродне, пра якую «Звязда» паведамляла ва ўчарашнім нумары, ліквідаваны ў той жа дзень да 23 гадзін. Калі дакладней, то для аднаўлення падачы цяпла ў жыллё (аварыя датычылася прыкладна 70 % кватэр у абласным цэнтры) і іншыя аб'екты спатрэбілася 20 гадзін. Магчыма, учора яшчэ заставаліся лакальныя праблемныя ўчасткі, але там прымаліся аператыўныя захады. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА.**

— Хочацца выказаць словы ўдзячнасці доблесным супрацоўнікам МНС, якія выратавалі людзей. Калі б выратавальнікі прыбылі на месца аварыі хвілін на 10-15 пазней, то мы б страцілі нашых жыхароў. Бо сітуацыя была крытычнай: дзеці залезлі на падаконнікі, а пад нагамі ў іх быў кіпень — яны плакалі, крычалі ад жаху. 21-гадовы супрацоўнік МНС упаў у яму з гарачай вадой, атрымаў моцныя апёкі, але дзіця, якое ён нёс на сваіх руках, не пацярпела. І няпраўда, калі кажуць, што, маўляў, моладзь у нас не тая, як калісьці ... У нас цудоўная моладзь, што даказвае ўвесь гэты ўзор мужнасці, сапраўднага гераізму, — зазначыў Сямён Шапіра.

**Начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Пётр КОРЖЫК** паведаміў, што траўмы пры ліквідацыі наступстваў аварыі атрымалі **сяржант унутранай службы Павел ЯНУШКЕВІЧ** (1991 г.н.) і **старшы сяржант Сяргей КОНЧЫК** (1990 г.н.). Павел, у якога асабліва моцныя апёкі, ужо пераведзены з рэанімацыі ў агульнае аддзяленне бальніцы. Урачы цвёрда заявілі, што яго жыццю нішто не пагражае, хоць балявыя наступствы, безумоўна, вельмі сур'ёзныя.

**Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО,** які ўзначальваў штаб па ліквідацыі наступстваў аварыі, расказвае:

— Я ў Гродне працую 34 гады, і такой аварыі на цеплатрасах у горадзе яшчэ не было. Работнікі МНС спрацавалі вельмі аператыўна. Кожная хвіліна была сапраўды на вагу золата. Такі прыклад. Жыхар аднаго з прыватных дамоў у раёне аварыі выскачыў яшчэ па сухой падлозе свайго будынка, каб разбудзіць суседа, а ўжо праз некалькі хвілін, калі вярнуўся, вада паднялася сантыметраў на 20. Добра яшчэ, што тэмпература першай вады, якая растапляла снег, была параўнальна невысокай. Аднак наступныя патокі вышынёй да метра, калі зямля прагрэлася, ужо дасягалі тэмпературы 90 градусаў.

Сямён Шапіра дае высокую ацэнку дзеянням штаба па ліквідацыі наступстваў гэтай аварыі, але разам з тым абяцае разабрацца, чаму яна здарылася:

— Прыношу жыхарам Гродна прабачэнні за нязручнасці ў сувязі з паніжэннем тэмпературы ў іх кватэрах. Мы сур'ёзна прааналізуем гэтую сітуацыю і зробім усе захады, каб болей такое не паўтарылася. Дзеянні некаторых службаў у нас сёння выклікаюць пэўныя сумненні.

У прыватнасці, старшыня аблвыканкама лічыць неабходным больш уважліва паглядзець на сістэму летняй падрыхтоўкі цеплавых сетак да зімовага ацяпляльнага сезона. Летам праходзілі гідраўлічныя выпрабаванні гэтага ўчастка магістральнай цеплатрасы, за якую адказвае прадпрыемства «Гроднаэнерга», пад ціскам вады ў 2,5 раза вышэй, чым у звычайным рэжыме, і праблем выяўлена не было.

— Вывучым, як праходзілі гэтыя выпрабаванні. Падругое, чаму так доўга праходзіла лакалізацыя аварыйнага ўчастка цеплатрасы? Чаму, убачыўшы падзенне ціску ў сістэме, дыспетчарскія службы імгненна не перакрылі гэты ўчастак? У выніку сістэма ацяплення страціла вялізную колькасць вады, і самая галоўная праблема была не ў ліквідацыі разрыву трубапровада, ад чаго фактычна залежалі 19 будынкаў, а ў запаўненні гэтай сістэмы нанова, ад чаго залежала нармалізацыя цеплазабеспячэння ўсяго горада. Калі б аварыйны ўчастак перакрылі аператыўна, то мелі бы праблему цеплазабеспячэння толькі 19 дамоў. А фактычна атрымалі праблему амаль усяго горада, — зазначае Сямён Шапіра.

Старшыня аблвыканкама таксама лічыць, што трэба больш рашуча заняцца заменай зношаных цеплasетак (аварыйны ўчастак адпрацаваў каля 40 гадоў), і асабліва магістральных, за якія адказвае Мінэнерга. Што датычыцца маёмасці жыхароў дамоў, якія пацярпелі ад разрыву цеплатрасы, то, як запэўніў Сямён Шапіра, усе страты ім будуць кампенсаваны — галоўным чынам за кошт вінаватых у гэтай аварыі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

## ЗНОЎ ПАДЗЕННЕ Ў МЕТРО

**Было каля 13.30, калі на станцыі сталічнага метрапалітэна «Пятроўшчына» на першы пуць на рэйкі ўпаў чалавек...**

Праз чатыры хвіліны работнікі станцыі дасталі на платформу 36-гадовага мінчаніна. Той быў нападпітку. У выніку падзення мужчына не пацярпеў. Мяркуецца, што прычына здарэння — асабістая неасцярожнасць. Спыненне руху электрацягнікоў склала 5 хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МЫ — У СЯБЕ ДОМА

### ДЗІЦЯЧАЕ ПЫТАННЕ

Цяпер у іх трое дзяцей. Яны — адна дружная сям'я. Хаця ў кожнага — свае абавязкі і захапленні. Ілья, як старэйшы, сочыць, каб малыя былі ў парадку. Яму 10 гадоў, і ён галоўны памочнік бацькоў. Даніла ў свае 5 гадоў любіць рабіць сюрпрызы.

Даяна, якой цяпер 3 гады, — маленькая прыгажуня сярод братоў-абаронцаў. У бландзінкі з блакітнымі вачыма сукенка з гуллівымі валанамі і ружовыя калготкі. Спектр яе інтарэсаў — ад матчынага бляску для вуснаў да «мосціку» і шпагату. Асновы харэаграфіі малая вучыць разам з маці, вялікай аматаркай фізічных заняткаў і ўладальніцай падцягнутай фігуры.

Гавораць, што чалавек да ўсяго хутка прызвычайваецца — да дрэннага і добрага. Затое мігранты Клімковы маюць свежы погляд і адразу заўважаюць адрозненні. Напрыклад, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне: «крымскія» роды, кажа маці, каштавалі ім 1000 долараў, магілёўскія — нічога.

— Мне ўвогуле падабаюцца ў вас адносіны да дзяцей, — разважае Ірына. — Тут шмат робіцца для іх. Дзіцячы садок, гурткі для развіцця, мастацкая і музычная школы, гімнастычная секцыя. Дзеці займаюцца, мы і ў басейн ездзім у Быхаў. А ў Феадосіі на ўвесь горад адзін басейн — у атэлі, ды і той вельмі дарагі.

Дзеці ездзяць у школу і садок у аграгарадок Мокрае: аўтобус ходзіць спраўна, забірае малых амаль што ад дому. «Гэта вельмі зручна, калі працуеш», — упэўнены бацькі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



### СПАКОЙНЫ СТЫЛЬ

Пакуль жыццё Клімковых яшчэ падобнае на прымаўку пра рай з мілым у шалашы. Але яны ўдзячныя за тое, што маюць. Цагляны дом, які атрымалі нядаўна, новыя гаспадары паступова абжываюць яго і даводзяць да ладу. Увесну з'явіцца агарод. Але ўсё ж пад Новы год Ірына прызнаецца, што марыць пра дом з выгодамі: «Ну хаця б каб была вада, якую не трэба бясконца цягаць з калонкі!»

Унутры дом пакуль нагадвае жыллё аматараў мінімалізму. Самай неабходнай мэбляй абсталяваны толькі дзіцячы пакой — там ложак у два ярусы і стол з камп'ютарам, а таксама бацькоўская спальня.

«Усё набудзем з цягам часу», — абяцаюць сабе і дзецям Ірына і Дзяніс. Што з таго, што гасцёўня пустая? Затое яна вольная для навагодніх гульняў! Тут хутка ўсталююць і ўпрыгожаць ёлку, пакладуць пад яе падарункі, Даяна-Снягурка павядзе вакол яе карагод.

Увогуле, спачатку маладая сям'я жыла ў абласным цэнтры, дзе Дзяніс зарабляў як круп'е ў казіно. У горадзе нібыта больш магчымасцяў і выгод, але і стыль жыцця адпаведны. Найбольш Ірыну турбавалі высокая плата за арэнду кватэры і вялікія адлегласці — пераадоленне іх грамадскім транспартам забірала нямала часу. Таму Клімковы асмеліліся яшчэ на адзін пераезд.

— У мяне ў Гарадцы былі знаёмыя, якія запрасілі папрацаваць на камбайне, — расказаў Дзяніс. — Потым прапанавалі застацца, паабяцалі жыллё. Так з круп'е я стаў механізатарам у сельскагаспадарчым філіяле «ПМК-85 Вадбуд». Жонка — эканамістам. Праца ёсць, грошы плацяць, усё нармальна. У вёсцы ўсё ж больш спакойна жывецца. А калі трэба ў горад, то выкарыстоўваем аўтамабіль.

### «НАМ ТУТ ЖЫЦЬ ЛЕПШ»

Ірына прызнаецца, што спачатку ўсё ж вельмі сумавала па Крыме.

— Але потым разнаёмілася, цяпер ужо ў гутарцы і беларускія словы праскакваюць. Тут больш спакойныя людзі. Калі я цяпер прыязджаю дадому, то маці жартуе, што я зусім беларускай стала, бо нікуды не спяшаюся. У Крыме іншае, больш імклівае жыццё: там трэба бегаць і «круціцца, гаворыць яна і дадае: «Нам тут жыць лепш. Як бы гэта для вас звыкла ні гучала, ёсць стабільнасць. Можна знайсці працу і атрымаць за яе легальныя грошы, а не тыя, што ў канверце. І людзі да нас добра ставяцца: не як да чужых, а як да сваіх.»

Доказ гэтаму — пераднавагоднае павышэнне па службе. Ужо пасля паездкі ў Гарадзец стала вядома, што Дзяніс пачаў выконваць абавязкі кіраўніка сельскагаспадарчага філіяла.

Новы год Клімковы сустрэнуць у сваёй вёсцы. Суседзі ўжо запрасілі іх у госці.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**
*Быхаўскі раён.*

■ Цёплы паратунак

## ПАШПАРТ, ГАРБАТА, БЯСПЛАТНАЯ ЛАЗНЯ...

**Наведванне вышэйпазначанай установы без аплаты дазволілі мінскім бяздомным. У рамках акцыі «Сацыяльны патруль», якую праводзяць у сталіцы з 17 снежня, кожны чацвер з 12 да 14 гадзін, асобы без пэўнага месца жыхарства могуць бясплатна карыстацца паслугамі гарадской лазні № 14.**

Пра гэта паведаміла журналістам намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Ірына Дудка падчас прэс-канферэнцыі.

— Гэтая акцыя скіравана на падтрыманне бяздомных і аказанне ім дапамогі падчас халадоў, — адзначыла Ірына Мікалаеўна. — Да ўдзелу далучаюцца як сацыяльныя службы, так і службы аховы здароўя, валанцёры, грамадскія арганізацыі. У месцы, дзе найчасцей збіраюцца бяздомныя, прывозяць гарбату, ежу і некаторыя цёплыя рэчы.

Таксама бяздомным могуць дапамагчы ў аднаўленні дакументаў альбо паспрыяць у наладжванні сувязяў з сям'ёй, калі гэта магчыма. Па жаданні бяздомнага, яго могуць накіраваць у дом начнога знаходжання.

Дзейнічаць «Сацыяльны патруль» будзе да 1 сакавіка. Па інфармацыі камітэта па працы, дапамогу пакуль аказалі 17 бяздомным. Калі людзі жадаюць падзяліцца цёплымі рэчамі альбо паведаміць пра асоб без пэўнага месца жыхарства, якім патрэбна дапамога, яны могуць патэлефанаваць у камітэт па працы і сацыяльнай абароне па тэлефоне 285-01-82 альбо ў любы тэрытарыяльны цэнтр Мінска.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■



## СНЕГУ НАМЯЛО

**Мінскія двары застаюцца ў палоне надвор'я.**

Гэта праблема асабліва актуальная ў спальных раёнах. Некаторыя аўтааматары пакінулі свае машыны пад снежным покрывам, выбіраючы грамадскі транспарт. Колькасць паркавачных месцаў скарачаецца таму, што машыны, прыпаркаваныя не па правілах, абцяжарваюць рух не толькі іншых машын, але і пешаходаў. У сувязі з неспрыяльным прагнозам надвор'я Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт просіць гараджан прыняць больш актыўны ўдзел у прыбіранні снегу ў дварах. Актыўнасць мінчан стала добрай дапамогай для жыллёвых службаў, бо менавіта гасцявыя паркоўкі з'яўляюцца самымі складанымі для ўборкі снегу ўчасткамі.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**







# «ОЙ, МА-МА-ЧКІ!»... БЕЛАРУСКАЕ КІНО!

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

На другі конкурс «Беларусьфільм» падаў ажно 69 праектаў (13 гульнявых, 38 дакументальных, 16 анімацыйных). Спроба пераходу кінематографа нашай краіны на прадзюсарскую сістэму дзяржаўнага рэгулявання скарэктавала становішча кінастудыі як манапаліста ў галіне кінавытворчасці. І прымусіла Нацыянальную кінастудыю перагледзець свае жанравыя і тэматычныя схільнасці. Праўда, пра астатніх пераможцаў конкурсу нешта не асабліва чуваць. На якой стадыі рэалізацыі знаходзяцца іх часткова прафінансаваныя дзяржавай праекты? Або пераможцы такія сціплыя, або ўся гэтая гісторыя з конкурсам, прадзюсарствам і фінансаваннем — істотнае перабольшанне? Або яны грошы атрымалі, але маюць нейкія перашкоды на іншых стадыях стварэння кінапрадукту?..

Адной са стужак «Беларусьфільма», якая прайшла конкурсны



Тэлевізійны серыял (10 серый) «Паляванне на гаўляйтара» рэжысёра Алега Базілава («Беларусьфільм» сумесна з таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Стар Медыя Дыстрыб'юшн») часткова здымалі ў Віцебску.

адбор, стала карціна «Ой, ма-ма-чкі!» паводле сцэнарыя Юліі Ляшко і Людмілы Перагудавай. Гэта 12-серыйны тэлесерыял пра складанае і вясёлае, трагічнае і камічнае жыццё ўрачоў і будучых мам у аддзяленні паталогіі цяжарнасці. Сумесна з расійскай кампаніяй «Трагір Прадакшн» рэжысёр Іван Паўлаў зняў ужо 2 серыі тэлефільма. Яшчэ 10 серый абяцаюць закончыць акурат да наступнага Новага года. Праўда, ёсць адна непрыемнасць.

Як расказаў **генеральны дырэктар кінастудыі Алег СІЛЬВАНОВІЧ,** расіяне, даведаўшыся пра задуму беларускіх кінематаграфістаў і дужа ўпадабаўшы ідэю такога фільма, паспелі ўжо зняць два серыялы з падобнымі сюжэтамі і нават сугучнай назвай. Што зробіш, калі ў іх серыяльная вытворчасць ужо канвеер, а ў нас — штучны прадукт. Добра гэта ці дрэнна, адназначна сказаць складана. Прынамсі, Іван Паўлаў запэўнівае, што ён імкнуўся пазбягаць

**Або пераможцы такія сціплыя, або ўся гэтая гісторыя з конкурсам, прадзюсарствам і фінансаваннем — істотнае перабольшанне?**

прымітыўных «мыльных» хадоў і рабіць больш-менш жывы, аўтарскі серыял. Праўда, нягледзячы на важнасць тэмы мацярынства (асабліва ў святле дэмаграфічнага крызісу Беларусі), мне здаецца, сама серыяльная форма і стылістыка наўрад ці пасуюць кінастудыі, якая мае статус нацыянальнай...

З іншага боку, калі раней інфармацыя пра аказанне «Беларусьфільмам» тэхнічных паслуг расійскім кампаніям не знаходзілася на паверхні і была мала каму вядомая, то сёння яе смела агучваюць услых. І ўжо не сорамна сказаць, што ў 2012 годзе «Беларусьфільм» аказваў вытворчыя паслугі 23 кінакампаніям Расіі. Што на пляцоўках студыі працавалі такія вядомыя рэжысёры, як Валерый Тадароўскі, Аляксандр Міта, Сяргей Гінзбург, Дзмітрый Астрахан, Юрый Мароз і інш. Што 7 замежных і айчынных кампаній сталі асноўнымі партнёрамі кінастудыі па сумеснай кінавытворчасці. Таму што акупнасць сёння таксама мае значэнне. Калі не за кошт продажу маёмасных правоў на фільмы ўласнай вытворчасці, дык хоць за кошт аказання паслуг. Магчыма, гэта толькі першыя крокі. Зрэшты, грошы таксама трэба зарабляць, каб было што ўкласці ў дастойныя праекты. Як, напрыклад, здарылася з фільмам Сяргея Лазніцы «У тумане». У гэты фільм кінастудыя ўклала 8% ад агульнага бюджэту фільма. Мала. Але важка.

— А калі сам рэжысёр Сяргей Лазніца падзякаваў кінастудыі і Беларусі за дапамогу, — перакананы Алег Сільвановіч, — то мы можам з упэўненасцю лічыць, што гэтая стужка і нашай кінастудыі таксама.

Дарэчы, сёлета ўпершыню за ўсю гісторыю «Беларусьфільма» стужка, сярод вытворцаў якой і наша кінастудыя, не толькі заваявала Гран-пры кінафестывалю «Лістапад», але і ўпершыню была прадстаўлена на Канскім кінафестывалі дзе яшчэ атрымала там прыз ФІПРЭСІ.

Усяго ў 2012 годзе фільмы кінастудыі бралі ўдзел у 30 кінафестывалях свету і атрымалі 60 узнагарод. Дакументальнае і анімацыйнае кіно было адзначана ў Германіі, Славакіі, Італіі, Літве, Расіі.

Асобнай увагі патрабуе і тэхнічнае пераазнашчэнне базы кінастудыі, асабліва, перавод у лічбавы фармат фільмафонду кінастудыі. У 2012 годзе «Беларусьфільм» цалкам перайшоў на лічбавыя тэхналогіі вытворчасці фільмаў, адмовіўшыся ад цэлюлоіднай плёнкі, якая выкарыстоўваецца ў свеце ўсё радзей і радзей, а таму каштуе даражэй і даражэй.

— З наступнага года мы збіраемся ўвесь фонд фільмаў кінастудыі (у тым ліку і тыя, якія мы прадаём расійскім тэлеканалам) з улікам новых тэхнічных патрабаванняў перавесці ў сістэму высокай якасці HD, — распавядае генеральны дырэктар «Беларусьфільма». — Значыць, трэба ўсё адсканаваць, зрабіць тэхнічную рэканструкцыю фільмаў. Гэта даволі сур'ёзныя фінансавыя затраты. На адзін фільм трэба патраціць ад 15 да 20 тыс. долараў. У нас пакуль няма на гэта грошай, але, я ўпэўнены, мы іх знойдзем. У нас няма і тэхнічных хуткасных сканераў. Мы запланавалі мадэрнізацыю нашага сканіравальнага абсталявання на пачатак наступнага года. Гэта дазволіць у 5 разоў паскорыць працэс пераводу фільмаў у іншы фармат.

Поруч з нястачай грошай існуе і нястача кадраў. Асабліва пакутуе ад гэтага беларуская анімацыя, якой, дарэчы, сёлета спаўняецца 40 гадоў.

— Не хапае прамалёўшчыкаў, аніматараў, людзей, якія знаёмыя з рознымі тэхнікамі ручной анімацыі, — распавядае **рэжысёр-аніматар Аляксандр ЛЕНКІН**, які са снежня 2012 года з'яўляецца мастацкім кіраўніком анімацыйнай студыі «Беларусьфільма».

Праблема адкрытага доступу да анімацыйных і дакументальных фільмаў кінастудыі таксама застаецца нявырашанай. Хаця нешта і выходзіць на DVD-дысках. На анімацыйнай студыі зроблена ўсяго 150 мультфільмаў. Не так і складана выдаць іх асобнай анталогіяй на дысках. Затое застанецца для нашчадкаў.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ Экслібрыс «Звязды»

# ШКАЛЯР І АЛХІМІК СУПРАЦЬ ПОСТМАДЭРНІЗМУ

**Рублеўская Людміла.**
**«Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега».**
**Раман, Рэдакцыя газеты «Звязда», 2012.**




Нядаўна на пленарным пасяджэнні навуковай канферэнцыі (а гэтыя часткі навуковых сустрэч традыцыйна вызначаюцца акадэмічнасцю і сухасцю выкладання матэрыялу) адна з выступоўцаў, прафесар філасофіі, адхілілася ад тэмы даклада, каб акрэсліць рысы сучаснай культурнай сітуацыі. Постмадэрнізм спрабуе ўплываць на ўсе сферы культурнага жыцця, яму ўласціва агрэсіўнае паўстанне супраць іерархій і структур.

На постсавецкай прасторы гэта было абумоўлена яшчэ і спецыфічнасцю гістарычнай сітуацыі: разбурэнне магістральнай лініі ў культуры выклікала да жыцця яе ўяўную роўнасць з маргінальным. Гэта прыводзіць да таго, што ў адным шэрагу на адным узроўні ставяцца класікі і другасныя пісьменнікі, і ўжо нібыта сорамна вяртацца да сістэмы іерархій, таму што чытач павінен выбіраць сам, нават калі не мае для гэтага развітага густу ці дастатковай кваліфікацыі.

Але ўсё-ткі на гэтым шляху мы не былі першымі. У пэўным сэнсе такое становішча нас ратуе: мы не паспелі заглыбіцца ў існаванне без каштоўнасцяў. А ў іншых краінах, дзе постмадэрнізм перамог, з наступствамі гэтай вікторыі першымі сутыкнуліся не філосафы, культуролагі і літаратуразнаўцы, а псіхіятры.

Падлеткі, праходзячы самаідэнтыфікацыю, не маглі знайсці апірышча ў новай культурнай сітуацыі, дзе дзецям нельга было навязваць нічога: ад маральных каштоўнасцяў да ўяўленняў пра ўласны пол. Аказалася, постмадэрнізм — гэта забаўкі для дарослых: лягчэй выбіраць, калі ўжо нешта маеш, можаш параўнаць. А дзіцячая псіхіка ламалася ад адсутнасці традыцыйнага выхавання, з яго тлумачэннем пра пэўнае і акрэсленае дабро і ліха, пра норму і яе адсутнасць, з пэўнымі забаронамі і навязваннем традыцый.

І дзіўным чынам новая кніга Л. Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» ўбудоўваецца адразу ў дзве тэндэнцыі: з аднаго боку, рамантычна-прыгодніцкае асветніцтва У. Караткевіча, з другога — паступаванне традыцыйных каштоўнасцяў як супрацьвага постмадэрнізму. Вядома, гэтыя тэндэнцыі сёння могуць разумецца як два бакі аднаго медаля.

«Загонны шляхціц» Пранціш Вырвіч, бедны, пазбаўлены магчымасці працягваць адукацыю, трапляе ў неверагодныя прыгоды, якія пачынаюцца з таго, што яму за медны шэлег прадаюць алхіміка Баўтрамея Лёдніка. І ўжо разам яны акунаюцца ў віхуру магнацкіх інтрыг і барацьбы за трон.

Хіба можа станоўча паўплываць на чытача тэкст, дзе шляхта гандлюе людзьмі, а магнаты лёгка пазбаўляюць падданых волі і жыцця? Можа, калі праз тэкст чырвонай ніткай праходзіць уяўленне пра гонар. Гонар, які можна захаваць у беднасці ці нават рабстве: *«Шкаляр глядзеў на доктара, які стаяў перад ім на каленях з апушчанай галавой, але спіна па-ранейшаму была выпрастаная, не сагнутая пакорліва <...> Але Лёднік, няправільны доктар, які вынайшаў філасофскі камень і адрокся ад яго, умудраўся стаяць на каленях так, што ў гэтым бачылася няправільнасць, несправядлівасць, і Вырвічу было невыносна яго прыніжэнне...»*

На фоне магнацкай вакханаліі дзейнічаюць героі, для якіх слова мае значэнне. Якія гатовы нашкодзіць сабе, але толькі не парушыць прысягу. Якія гатовы ахвяраваць сабой дзеля сябра, хай нават сябар той нястрымны і несправядлівы. Героі, якія могуць адмовіцца ад прыбытковай справы (алхіміі і астралогіі), усвядоміўшы яе грахоўнасць. Героі, якія ўмеюць захоўваць вернасць каханню.

Паводзіны доктара Лёдніка — яшчэ і ўвасабленне паняцця пра адказнасць. Колішні алхімік разумее, што эмацыянальны і няўрымслівы Пранціш Вырвіч яшчэ патрабуе далікатнага апекавання. Былы шкаляр не можа адэкватна выявіць свае эмоцыі і, бывае, за гневам хавае крыўду, але доктар Лёднік умее за грубымі словамі пачуць крык пра дапамогу. І калі развязваюцца іх адносіны «гаспадар — маёмасць», яны не разыходзяцца, бо адчуваюць глыбокую патрэбу адно ў адным.

Кніга ўпісацца ў традыцыйныя парадаксальныя працэсы беларускай літаратурнай пераемнасці: для некага полацкія лабірынты і падземная бібліятэка з кнігі Л. Рублеўскай апярэдзяць «Лабірынты» В. Ластоўскага. Але ці мае значэнне паслядоўнасць з'яўлення полацкіх сутарэнняў у свядомасці чытача, калі яны там наогул будуць? Гэта своеасаблівая культурная кантрабанда, якой так шмат трэба ў сучаснай культуры.

Л. Рублеўская, разгарнуўшы падзеі на фоне вірлівага XVIII ст., нібыта асцерагаецца, што яе зграбны і чытэльны тэкст будзе ўспрыняты літаральна, як проста займальная гісторыя пра шкаляра і алхіміка, — і піша прадмову да кнігі.

У падлеткавым узросце прадмовы звычайна не чытаюць, хай сабе там нават вытлумачаюцца нюансы дзяржаўнага жыцця ў адпаведныя часы, значэнне беларускай мовы і тагачасны статус беларускіх жанчын, у адрозненне ад расійскіх.

Л. Рублеўская, напісаўшы так многа і такіх розных твораў, становіцца заложніцай уласнага іміджу. Насамрэч, у прадмове аўтарка звяртаецца, хутчэй, да крытыкаў і літаратуразнаўцаў, каб за ўяўнай лёгкасцю тэксту яны заўважылі і працу гісторыка-даследчыка, і місію папулярызатара беларушчыны, і пісьменніцкае майстэрства.

Урэшце варта прызнаць, што трэба мець смеласць і нават нахабства, каб модным сёння ў літаратуры змрочнасці, безвыходнасці, песімізму і цынізму супрацьпаставіць традыцыйныя каштоўнасці — патрыятызм, веру, сяброўства, каханне, гонар і аптымізм.

**Аксана БЯЗЛЕПКІНА**

■ Наш фармат

# ЦУДЫ Ў ПАДАРУНАК

**Новы год — свята сямейнае: некалькі пакаленняў збіраюцца за адным сталом, бацькі рыхтуюць дзецям сюрпрызы «ад Дзеда Мароза». Гэта амаль што аксіёма. А як быць з тымі дзецьмі, якія засталіся без бацькоў, альбо тымі, хто вымушаны сустракаць самае чароўнае свята на бальнічным ложку?**

Вось ужо больш як 20 гадоў Беларускі дзіцячы фонд сустракае Новы год разам з тымі дзецьмі, каму больш за астатніх патрэбныя ўвага і клопат. Гэта маленькія пацыенты бальніц, дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі.

Сёлета традыцыйны дабрачынны марафон адкрыўся 14 снежня. На калядной ёлцы ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску сабралася больш як 200 дзяцей-сірот, якія знаходзяцца пад апекай або выхоўваюцца ў дзіцячых дамах па ўсёй краіне, дзяцей з малазабяспечаных сем'яў, хворых дзетак з цяжкімі дыягназамі. Маленькіх удзельнікаў ранішніка чакала не толькі сустрэча з казачнымі героямі і адразу некалькімі парамі Дзедаў Марозаў і Снягурак, але і салодкая «праграма» — падарункі ад спонсараў акцыі.

З гэтага дня стартавала дабрачынная акцыя «Нашы сэрцы — хворым дзецям». Валанцёры і актывісты Беларускага дзіцячага фонду ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах ладзяць навагоднія канцэрты і гульнявыя праграмы, прыходзяць з віншаваннямі і падарункамі ў дзіцячыя аддзяленні бальніц, школы-інтэрнаты і дзіцячыя дамы, прыходзяць на дом да цяжкахворых малых. «Каля 15 тысяч дзяцей, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі,

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.


атрымаюць дапамогу фонду, — расказала прэс-сакратар Беларускага дзіцячага фонду Юлія Капцэвіч. — Напрыклад, у Мінску нас чакаюць у апёкавым аддзяленні бальніцы хуткай дапамогі, траўматалагічным аддзяленні 6-й бальніцы, дзіцячым аддзяленні РНПЦ псіхічнага здароўя, дзіцячым аддзяленні РНПЦ кардыялогіі».

Дарэчы, марафон добрых спраў працягнецца да 10 студзеня 2013 года, так што ва ўсіх ахвотных яшчэ ёсць час і магчымасць далучыцца да яго. Беларускі дзіцячы фонд будзе ўдзячны за любую дапамогу. Але, безумоўна, галоўная падзяка — шчаслівыя вочы дзяцей, для якіх ажывае казка і здзяйсняюцца мары...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

20 снежня 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15710)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


UZARI:

# «ПЕСНЯ — ЯК ДЗІЦЯ, ЯКОЕ НАРАДЖАЕЦЦА, КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ЯГО ЧАС»



**Гэты выканаўца не баіцца прымяраць на сябе новыя вобразы. Ён ведае, што эксперыментаванне — складнік развіцця і руху наперад. Але ўсё гэта натуральна спалучаецца ў ім з жаданнем быць да канца шчырым з тымі, з кім ён размаўляе на мове музыкі. Сярод блізкіх яму па духу такія музыканты, як Джэймі Вун, Джэймі Калум, Бобі Макферын і Майкл Джэксан. Яго песні сёння гучаць не толькі ў яго ўласным выкананні, але і суправаджаюць пластычны спектакль ці папаўняюць рэпертуар юных талентаў. Uzari, музыкант у трэцім пакаленні, спрабуе сябе адначасова ў іпастасях кампазітара, аранжыроўшчыка і акцёра, але застаецца ў душы філосафам...**

**— Uzari, скажы, якія ўражанні пакінуў сёлетні адбор на Еўрабачанне?**

— Я, як і летась, прытрымліваюся меркавання, што Еўрабачанне — гэта своеасаблівы Дыснэйлэнд. Гэты конкурс, як і любы іншы, проста бізнэс. Такое становішча сёння ў многіх сферах: мадэльны бізнэс, кіно, тэатр і музыка. Лічыцца, што там, дзе ёсць вялікія грошы, будуць поспех і папулярнасць. Калі я ўдзельнічаў у Еўрафэсце ці ў адборы гэтага года, то ішоў не па галасы. Я казаў пра гэта і да пачатку конкурсу, кажу і зараз. У мяне пыталіся, чаму я нідзе немагчыма знайсці маю песню, чаму я нідзе яе не выкладаю? Тлумачу: мне важна было, каб слухачы пачулі яе менавіта 7 снежня. Мне хацелася ведаць іх рэакцыю і першыя ўражанні.

**— Каму з калег па сцэне сімпатызавалі?**

— Па-першае, я не ставіў сабе мэту ўдзельнічаць у конкурсе. Для мяне гэта была магчымасць падзяліцца сваімі думкамі з аўдыторыяй. Калі б мяне абралі, то я лічыў бы сваім абавязкам з'ездзіць на Еўрабачанне. Да ўдзельнікаў адбору я не ставіўся як да канкурэнтаў, а проста хацеў знайсці з імі агульную мову. Падзяліцца нечым сваім і навучыцца чамусьці ў іншых. Я вельмі станоўча ставлюся да гурта Nuteki, мы з імі яшчэ з мінулага года падтрымлівалі адзін аднаго. У нас, можна сказаць, сяброўска-брацкія адносіны. У гэтым годзе ў фінале быў таксама Аляксей Грос. Гэты чалавек адказна ставіцца да таго, што ён робіць і для каго. Безумоўна, усе таленавітыя па-свойму і ў кожнага свая ніша.

**— Плануеш і надалей браць удзел у адборы на Еўрабачанне?**

— Не ведаю. Мабыць, у кожнага артыста ёсць жаданне выступіць на такой вялікай сцэне. І справа нават не ў конкурсе, а менавіта ў маштабах сцэны. Калі мне пашчасціла патрапіць туды з Анастасіяй Віннікавай, то мне цікава было зразумець сутнасць гэтага конкурсу і што вабіць туды артыстаў. Аказваецца, справа ва ўзроўні арганізацыі. Адчуваеш згуртаванасць каманды, дзе людзі ведаюць сваю справу лепш за іншых. Там і артыстаў паважаюць, і робяць гэта абсалютна шчыра. Там ты разумееш, якой павінна быць праца ў камандзе, калі працуеш над нейкім матэрыялам, і да гэтага трэба падыходзіць не толькі з душой, але і з адказнасцю. Мне хочацца быць там, каб падзяліцца сваімі думкамі. Расказаць аб тым, што ў нашай краіне многа таленавітых людзей, якія здольны дасягнуць сусветнага ўзроўню.

**— У тваім кліпе на песню Tell Me у цябе вобраз такога... сучаснага эльфа. Як узнікла ідэя?**

— Гэты вобраз я назваў бы святлом, што ідзе з дзяцінства. У дзіцячыя гады я шмат часу бавіў менавіта ў лесе. Мы з сябрамі там ладзілі шалашы, прыбіралі смецце і ставілі шыльды «Не пакідайце смецце!». Зараз я таксама часта заходжу ў лес, каб проста адпачыць і паслухаць дыханне дрэў. Я наогул вельмі трапятліва стаўлюся да прыроды.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

*Расклад на заўтра*

## Якія магчымасці, аднак!

### Выбіраем спецыяльнасць па душы?

*Віртуальнае залічэнне даказала: тое, што добра для абітурыентаў, зусім не абавязкова стасуецца з інтарэсамі рэгіянальных ВНУ*

**Укараненне аўтаматызаванай сістэмы прыёму заяў і залічэння можа ўзмацніць адток адораных абітурыентаў з рэгіёнаў у сталіцу — да такой высновы прыйшлі арганізатары эксперыменту па віртуальным залічэнні, які праводзіўся падчас сёлетняй прыёмнай кампаніі на базе шасці ўстаноў вышэйшай адукацыі.**

У эксперымент былі ўцягнуты БДУІР (34 спецыяльнасці), БНТУ (6 спецыяльнасцяў), Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (5 спецыяльнасцяў), Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт (5 спецыяльнасцяў), Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны (6 спецыяльнасцяў) і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы (таксама 6 спецыяльнасцяў). У згаданых установах быў вызначаны агульны пералік экзаменацыйных і тэхніка-тэхналагічных спецыяльнасцяў. Абітурыентам, якія падавалі дакументы на дзённую бюджэтную форму навучання, прапаноўвалася запоўніць анкету і ўказаць у ёй да пяці прыярытэтаў свайго залічэння (зыходзячы з прапанаванага спіса). Варыянты паступлення маглі ўказвацца як у рамках адной ВНУ, так і ў рамках усіх ВНУ, што былі задзейнічаны ў эксперыменце. Задачай камп'ютарнай праграмы было падлічыць, куды і на якую спецыяльнасць змог бы паступіць абітурыент са сваім наборам сертыфікатаў, калі б аўтаматызаваная сістэма залічэння працавала не ў віртуальным рэжыме.

### Залічэнне без захавання нюансаў

Уся інфармацыя пасля завяршэння прыёму дакументаў, як і вынікі залічэння, былі перададзены ў БДУІР для апрацоўкі і аналізу вынікаў віртуальнага залічэння.

— Хачу звярнуць увагу, што эксперымент праводзіўся з улікам шэрагу адступленняў, — расказаў **прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі па вучэбнай рабоце і інфарматызацыі Барыс НІКУЛЬШЫН.** — Так, конкурс сярод абітурыентаў праходзіў хоць і ў адпаведнасці з дзейнымі правіламі прыёму, аднак без уліку асаблівасцяў парадку прыёму, які дзейнічае ў кожным універсітэце. Залічэнне выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ ажыццяўлялася па агульным конкурсе, без уліку лічбаў прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Не браліся пад улік таксама медыцынскія супрацьпаказанні пры фарміраванні абітурыентамі прыярытэтнага пераліку спецыяльнасцяў.

> **«Калі б аўтаматычнае залічэнне праводзілася ў рэчаіснасці, то рэгіянальныя ВНУ маглі страціць да 30% сваіх студэнтаў»**

Усяго было апрацавана 1880 анкет абітурыентаў, што склала 58,9% ад тых, хто рэальна ўдзельнічаў у конкурсе на 62 спецыяльнасці шасці ўніверсітэтаў (у абітурыентаў была магчымасць адмовіцца ад запаўнення анкеты). Разам з тым, толькі 40% удзельнікаў эксперымента скарысталіся магчымасцю ўказаць усе пяць спецыяльнасцяў, 6% указалі чатыры спецыяльнасці, 18% — тры, 20% — дзве спецыяльнасці, а 16% указалі ўвогуле толькі адну.

69% тых, хто стаў студэнтам, паступілі па першую (са свайго пераліку прыярытэтаў) спецыяльнасць. На думку Барыса Нікульшына, такі вынік пацвярджае ўсвядомлены падыход абітурыентаў да выбару спецыяльнасці, адэкватнасць іх самаацэнкі, а таксама эфектыўнасць прафарыентацыйнай работы.

Арганізатараў эксперыменту цікавіла і так званая акадэмічная мабільнасць абітурыентаў — прасцей кажучы, іх гатоўнасць паехаць атрымліваць жаданую спецыяльнасць у іншы горад. Высветлілася, што да гэтага гатова досыць вялікая колькасць абітурыентаў з рэгіёнаў (ад 62% у Гродзенскай вобласці да 100% у Гомельскай). Затое з мінчан пагадзіліся б паехаць у іншы горад атрымліваць адукацыю толькі 6,7%. Нават калі б са сваімі баламі ў іх не было шанцаў паступіць у сталічныя ВНУ.

— Атрымліваецца, што калі б аўтаматычнае залічэнне праводзілася ў рэчаіснасці, то рэгіянальныя ВНУ маглі б страціць да 30% сваіх студэнтаў. Зрэшты, праблемы з'явіліся б і ў сталічных ВНУ, бо месцаў у інтэрнатах для іншагародніх студэнтаў не хапае і сёння, — дадаў Барыс Нікульшын.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

*Выпрабавана на сабе*

## Нялёгка быць ЦЯЖАРНАЙ

**Нядаўна міжнароднае агенцтва па вывучэнні грамадскай думкі Gallup апублікавала вынікі аднаго сацыялагічнага даследавання. Згодна з ім, беларусы — адна з самых абыякавых у свеце нацый. Маўляў, толькі 38% апытаных адказалі, што адчуваюць штодзённа не менш як дзесяць станоўчых і адмоўных пачуццяў. Каб пераканацца, ці сапраўды беларусы такія абыякавыя, я вырашыла... стаць цяжарнай.**

Вядома, не па-сапраўднаму, а ў якасці эксперыменту. Як той казаў, адчуць на сабе, наколькі нашыя суграмадзяне спачувальныя. Хаця б да такой катэгорыі насельніцтва, як будучыя маці.

### Пільная жанчына і здзіўлены сусед

Ручнік, адмыслова скручаны і схаваны пад куртку, выдаваў прыкладна сёмы месяц цяжарнасці. Прамільгнула думка: «Можа, занадта вялікі?..» Але вырашыўшы, што менавіта такі «жывот» немагчыма не заўважыць, я выйшла з дому. Шлях мой ляжаў на пошту: можа, цяжарную жанчыну хто-небудзь прапусціць наперад у чарзе?

Крочыла, нязвыкла запавольваючы хаду (цяжарныя не лятаюць!) і крыху саромеючыся. Як высветлілася, было чаго: па дарозе сустрэла... суседа. Ад здзіўлення ён нічога не сказаў, а толькі правёў мяне доўгім позіркам: яшчэ ўчора бачыў мяне «нармальнай», а сёння — «глыбока цяжарнай». «Нічога, — супакойваю сябе, — дзеля эксперыменту можна і пацярпець».

> **Усе астатнія не бачылі, утаропіўшы вочы ў тэлефоны. Або рабілі выгляд. Побач са мной павіс на поручні сівы худзенькі дзед, якога таксама «не бачылі».**

На пошце працавалі дзве касы, у кожнай — па тры чалавекі ў чарзе. «Нягуста». Але ўсё ж стала да аднаго з акенцаў. Асаблівай увагі на мяне ніхто не звярнуў, хіба што жанчына, якая стаяла перада мной, пераставіла на іншы бок свой пакунак. Падумала, што ўкраду, ці што? Наперад мяне таксама ніхто не прапусціў. Крыху расчараваная, я аплаціла рахункі і рушыла дадому.

### Мужчыны нават не рэагуюць...

Затое паездкі ў транспарце прынеслі мне куды больш карыснага, хоць і даволі нечаканага досведу.

У паўнюткім тралейбусе 55-га маршруту ўсе месцы былі занятыя. Я стала на задняй пляцоўцы, дзе мяне бачылі пасажыры, прынамсі, з шасці сядзенняў. Займалі іх мужчына, два хлопцы, дзве дзяўчыны і бабуля, якая з цікаўнасцю пагладала на мяне. Усе астатнія не бачылі, утаропіўшы вочы ў тэлефоны. Або рабілі выгляд. Побач са мной павіс на поручні сівы худзенькі дзед, якога таксама «не бачылі».

**(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА Чырвонай змены
20 12 2012 г.

# Якія магчымасці, аднак!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Яшчэ адна праблема — гэта незапоўненыя бюджэтныя месцы пасля першай аперацыі па залічэнні — а такіх было каля 6%. Пры лакальным выкарыстанні аўтаматычнай сістэмы залічэння ў рамках адной ВНУ гэта праблема вырашаецца прыёмнай камісіяй ВНУ, што немагчыма пры міжвузаўскім варыянце функцыянавання сістэмы. Такім чынам, з пашырэннем маштабаў эксперыменту можна чакаць і павелічэння колькасці вакансій, таму могуць спатрэбіцца і дадатковыя аперацыі па залічэнні. Узнікалі таксама і праблемы з ранжыраваннем абітурыентаў з паўпрахаднымі баламі. Сёння для залічэння пры паўпрахадным бале ў розных ВНУ вызначаны розныя прыярытэты. Адмаўленне ад унутрывузаўскіх ільгот у рамках эксперыменту прывяло ў асобных выпадках да праблем з ажыццяўленнем залічэння.

## Высокія балы — гарантыя паступлення

Разам з тым, эксперымент прадэманстраваў і бясспрэчныя вартасці выкарыстання аўтаматызаванай сістэмы прыёму заяў і залічэння. Так, цалкам была ліквідавана так званая праблема апошняга дня. У рэальным конкурсе частка абітурыентаў (у БНТУ — 27%, а ў БрДТУ — 12%) да апошняга моманту перападавалі свае заявы на іншыя спецыяльнасці. У той жа час у БДУІР, дзе аўтаматызаваная сістэма залічэння дзейнічае ўжо два гады, праблемы апошняга дня не назіраецца.

Больш за тое, 30% абітурыентаў, якія заявілі ў пераліку прыярытэтаў некалькі спецыяльнасцяў, «паступілі» на другую і наступныя спецыяльнасці. Такім чынам, зменшылася колькасць незалічаных абітурыентаў з высокімі баламі. Павялічыўся і прахадны бал на прэстыжныя спецыяльнасці ў сталічных ВНУ.

Эксперымент у чарговы раз даказаў, што ёсць праблемы, якія маюць прынцыповы характар для ўкаранення аўтаматызаванай сістэмы ў маштабах усёй краіны.

**Эксперымент у чарговы раз даказаў, што ёсць праблемы, якія маюць прынцыповы характар для ўкаранення аўтаматызаванай сістэмы ў маштабах усёй краіны.**

— Па-першае, гэта неабходнасць уніфікацыі парадкаў прыёму па арганізацыі конкурснага адбору ва ўсіх ВНУ. Ну і, безумоўна, ліквідацыя асобных конкурсаў для абітурыентаў з горада і сельскай мясцовасці, — падкрэсліў Барыс Нікульшын.

Зрэшты, пераход ад існуючай арганізацыі прыёмнай кампаніі да цэнтралізаванага яе правядзення спецыяльна створанай структурай (гэтую ролю можа выконваць Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў) усё роўна не дазволіць цалкам скасаваць прыёмныя камісіі ў ВНУ. Тым у любым выпадку давядзецца займацца прыёмам арыгіналаў дакументаў і афармленнем загадаў. А дадатковыя аперацыі па залічэнні расцягнуць у часе прыёмную кампанію, што, у сваю чаргу, пасуне графік правядзення прыёмнай кампаніі ў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Праграміст ці эканаміст?

Але згаданых праблем можна пазбегнуць, калі ВНУ будуць выкарыстоўваць аўтаматызаваную сістэму ў карпаратыўным рэжыме. Гэта значыць, што ўніверсітэты, фарміруючы парадкі прыёму, будуць размяркоўваць спецыяльнасці як для ўнутрыўніверсітэцкага, так і для міжуніверсітэцкага карпаратыўнага конкурсу, а абітурыенты — камбінаваць з прапанаванага пераліку свой прыярытэтны пералік. Такі падыход дазволіць установам вышэйшай адукацыі захаваць самастойнасць у фарміраванні набору і аператыўна запаўняць вакантныя месцы на «нямодных спецыяльнасцях».

На думку кіраўніцтва БДУІР, аўтаматызаваная сістэма залічэння ў большай ступені адпавядае ідэям прафарыентацыі моладзі, паколькі калі абітурыент хоча стаць фізікам або матэматыкам, праграмістам ці эканамістам, то ён не стане ўказваць у прыярытэтах далёкую ад сваіх схільнасцяў спецыяльнасць. Пры цяперашняй жа сістэме зрабіць адэкватны аналіз прафесійных пераваг абітурыентаў проста нерэальна: многія абітурыенты паступаюць не туды, куды хочуць, а туды, куды, па іх меркаванні, яны могуць паступіць на «бюджэт». А калі абітурыентам прапануецца ўказаць не адну, а адразу пяць спецыяльнасцяў, яны могуць выбраць тую, якая, з аднаго боку, будзе ім па душы, а з іншага — даступнай па балах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Іх універсітэты*

# БАРАЦЬБА ЗА АБІТУРЫЕНТА АБВАСТРАЕЦЦА

**Выбар свайго далейшага адукацыйнага маршруту кожны здзяйсняе, кіруючыся мноствам абставін: пачынаючы з паказчыкаў школьнай паспяховасці і заканчваючы планамі на перспектыву. Нехта заклапочаны тым, каб не з'язджаць далёка ад дома, а нехта, наадварот, хоча вырвацца з-пад бацькоўскага крыла, нават гатовы паехаць у суседнюю краіну, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Асабліва, калі да суседняй краіны літаральна рукой падаць. У журналістаў Беларусі і Расіі была магчымасць наведаць Смаленск, дзе сёння атрымліваюць вышэйшую адукацыю беларускія студэнты.**

Знаёмства са смаленскімі ВНУ пачалося з наведвання інфармацыйнага цэнтра па атамнай энергетыцы, якіх на тэрыторыі РФ налічваецца ўжо 15. Вядома, што ў сувязі з будаўніцтвам у Беларусі АЭС, дзейнічае праграма з'явіцца пры падтрымцы Росатама і ў Мінску. Інфармацыйны цэнтр — гэта добрая магчымасць атрымаць веды аб ролі атамнай энергетыкі ў жыцці сучасных людзей. Абсалютна ўсё тут — ад дызайнерскай ідэі афармлення цэнтра да кантэнту, які складаецца з навучальных праграм з інтэрактыўнымі часткамі — нацэлена на тое, каб зрушыць прафесійныя схільнасці абітурыентаў у бок атрымання інжынерна-тэхнічных спецыяльнасцяў. У цэнтры праводзяцца бясплатныя асветніцкія ўрокі для школьнікаў, ладзяцца розныя семінары і навучэнскія навукова-даследчыя канферэнцыі. Трэба дадаць, што цэнтр — цалкам некамерцыйны праект...

Смаленскі дзяржаўны ўніверсітэт не першы год прымае беларускіх абітурыентаў, якія потым становяцца сваімі ў студэнцкай сям'і. Зараз тут навучаюцца 225 беларусаў. Апошнім часам намецілася адмоўная дынаміка: у 2008 годзе колькасць беларусаў складала 277 чалавек. Магчыма, прычына ў дэмаграфічным крызісе? Сярод запатрабаваных у нашых грамадзян спецыяльнасцяў — «Менеджмент арганізацыі», «Упраўленне персаналам», «Прыкладная інфарматыка». Некаторыя выбіраюць «Псіхалогію», «Юрыспрудэнцыю» ці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва».

Пры паступленні беларускія абітурыенты хоць і належаць да катэгорыі замежных грамадзян, але маюць важныя прывілеі, прапісаныя ў міждзяржаўных пагадненнях, заключаных у рамках Саюзнай дзяржавы. Паступаць беларусы могуць як на платныя месцы, так і на бюджэтныя. Але калі для расіян абавязковая ўмова паступлення — гэта здача адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ), то беларускія абітурыенты маюць права праверыць свае веды альбо на АДЭ, альбо на ўнутраным экзамене ў ВНУ.

— Беларускія абітурыенты, як правіла, маюць пасля школы высокую падрыхтоўку. І таму адзіны дзяржаўны іспыт яны здаюць без праблем, — падзяліўся сваіміназіраннямі з журналістамі **прарэктар па сацыяльнай і пазавучэбнай рабоце Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзяніс МАТВЕЕНКАЎ**. — Калі яны жадаюць здаваць унутраны экзамен, то форма іспыту, як правіла, залежыць ад спецыяльнасці. Часта гэта тэставыя заданні, якія дазваляюць не толькі праверыць механічнае запамінанне, але і разуменне прадмета.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ёсць у беларусаў і яшчэ адна магчымасць стаць студэнтамі расійскіх ВНУ — прайсці спецыяльны адбор у беларускім Міністэрстве адукацыі. Такія абітурыенты без усялякіх іспытаў залічваюцца на бюджэтную форму навучання і нават атрымліваюць бонус у выглядзе акадэмічнай стыпендыі, незалежна ад паказчыкаў бягучай паспяховасці. Але калі праз нейкі час яны пажадаюць змяніць сваю спецыяльнасць, то зрабіць гэта яны ўжо не змогуць.

**Размеркавання пасля заканчэння ВНУ ў Расіі не існуе, як і гарантый, што вы ўладкуецеся па набытай спецыяльнасці, калі пажадаеце застацца ў суседняй краіне**

Падчас вучобы патрабаванні прад'яўляюцца аднолькавыя для ўсіх: і для расіян, і для беларусаў. Таму рознага кшталту парушэнні, нават курэнне ў недазволеным месцы, можа стаць падставай для выключэння з універсітэта. На першым курсе студэнты бюджэтнай формы навучання атрымліваюць акадэмічную стыпендыю ў памеры 1200 расійскіх рублёў, а потым ужо яе памер вар'іруецца ў залежнасці ад поспехаў на сесіі. Існуюць таксама павышаныя стыпендыі, якія прызначаюцца за выключныя поспехі ў навучальнай, грамадскай, творчай ці спартыўнай дзейнасці, — а гэта яшчэ 5000—6000 рублёў у дадатак да асноўнай стыпендыі. Да таго ж на першым і другім курсе можна прадаставіць даведку, якая дазволіць атрымліваць стыпендыю па сацыяльных паказчыках, калі ў гэтым ёсць патрэба.

Акрамя гэтага, стаўшы студэнтам, ёсць магчымасць атрымаць месца ў інтэрнаце, незалежна ад таго, навучаецеся вы на бюджэтнай форме ці на платнай. Але калі «бюджэтнікі» плацяць 55 рублёў за інтэрнат, то «платнікі» — усе 600 рублёў, плюс да гэтага асобна аплачваецца электраэнергія, спажытая вашым камп'ютарам, тэлефонам, чайнікам ці халадзільнікам. Між іншым, зімой, як прызналіся студэнты, ім часам даводзіцца грэцца і фенамі, і гарачай вадой з электрачайніка.

Бадай што самая сур'ёзная праблема ўзнікае з атрыманнем медыцынскай дапамогі. Без медыцынскага поліса, які замежнікам не выдаюць, паслугі ўрачоў можна атрымаць толькі на платнай аснове. Альбо ў паліклініцы беларускага студэнта папросяць прад'явіць працоўны дагавор з тэрмінам дзеяння не менш як шэсць месяцаў — у гэтым выпадку студэнты маюць права бясплатна абслугоўвацца ў паліклініках без медстраховак.

Ёсць праблемы і з працаўладкаваннем выпускнікоў. Размеркавання пасля заканчэння ВНУ ў Расіі не існуе, як і гарантый, што вы ўладкуецеся па набытай спецыяльнасці, калі пажадаеце там застацца. Між іншым, большасць беларускіх студэнтаў Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта не плануе вяртацца ў Беларусь, нават калі ім і не ўдасца ўладкавацца працаваць па сваёй спецыяльнасці.

Затое ў студэнтаў са Смаленскай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры, спорту і турызму ёсць магчымасць працаваць яшчэ падчас навучання: трэнерамі або настаўнікамі фізкультуры. Паколькі акадэмія з'яўляецца спецыялізаванай навучальнай установай, то паступаюць сюды нярэдка ўжо пасля вучылішчаў алімпійскага рэзерву ці з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Такім абітурыентам не трэба здаваць ніякіх іспытаў: ні дзяржаўных, ні ўнутраных. Праводзіцца толькі гутарка... А майстрам спорту з Беларусі аўтаматычна залічваецца на ўнутраным экзамене вышэйшы бал.

Сёння ў Смаленскай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры, спорту і турызму навучаюцца 324 беларуса, 90% — «бюджэтнікі». Пры гэтым 10% беларусаў з'яўляюцца членамі нацыянальных зборных па тых ці іншых відах спорту.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

## БАРАЦЬБА ЗА АБІТУРЫЕНТА...

**(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар. «ЧЗ».)**

Па словах рэктара спартыўнай акадэміі Георгія Грэца, большая частка беларускіх студэнтаў вяртаецца пасля навучання на радзіму, але «самую элітную частку тых, каго мы рыхтуем, пакідаем у сябе — прадастаўляем ім месцы ў аспірантуры ці прапануем работу ў акадэміі». Некаторыя (пасля змены грамадзянства) трапляюць у расійскія зборныя. У бліжэйшы час тут плануюць адкрыць кафедру экстрэмальных відаў спорту, дзе будуць рыхтаваць у тым ліку і аўтагоншчыкаў. А зараз найбольшым попытам сярод беларусаў карыстаюцца такія кірункі, як «фізічная культура і спорт», «адаптыўная фізічная культура» і «спартыўна-аздараўленчы турызм».

Зараз універсітэт вядзе грандыёзную будоўлю: у наступным годзе тут плануюць здаць вялікі спартыўны комплекс з 50-метровым басейнам, тэнісным кортамі, футбольным полем з падагрэвам, лёгкаатлетычным манежам, роледромам і іншымі спартыўнымі пляцоўкамі. А ў 2014 годзе здадуць новы 15-павярховы жылы комплекс, куды ўвойдуць студэнцкі інтэрнат, гасцініца і кватэры для маладых спецыялістаў. Адным словам, спакуса застацца ў суседняй краіне ў беларускіх студэнтаў будзе яшчэ большая...

**Алена ДРАПКО.**

**Алена ХАРКОВА, галоўны ўрач 33-й студэнцкай паліклінікі г. Мінска:**

*— Расійскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Мінску, мы абслугоўваем у рамках заканадаўства. Ёсць дамовы паміж нашымі краінамі, паводле якіх паслугі першай медыцынскай дапамогі аказваюцца бясплатна, а планавая дапамога патрабуе аплаты. Напрыклад, калі ваша захворванне мае пагрозу для жыцця, то першы прыём вы не аплачваеце, а за ўсе астатнія візіты да доктара плаціце. Але пры наяўнасці ў расійскіх студэнтаў віду на жыхарства яны маюць усе тыя ж правы, што і беларускія грамадзяне.*

# Нялёгка быць ЦЯЖАРНАЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Стоячы і захінаючы ад штуршкоў навакольных пасажыраў «жывот», я праехала чатыры прыпынкі, пакуль не адчула на сабе ўважлівы позірк. Глядзела дзяўчына, якая сядзела каля акна на адным з самых апошніх сядзенняў тралейбуса. Узняла на яе вочы і пачула: «Вы будзеце садзіцца?» — «Дзякуй, дзякуй вялікі!» — радасна заківала я, і мая падзяка сапраўды была шчырай. Аднак дабрацца да сядзення было не так проста. Для гэтага трэба было пералезці праз дзядзьку, што сядзеў з краю. «Вы не маглі б пасунуцца, а то я не залезу», — папрасіла, выпякаючы жывот. Той у адказ толькі глянуў на мяне спадылба ды крыху падабраў калені. Давялося чакаць прыпынку, каб залезці на сядзенне. Сітуацыя паўтарылася, калі мне трэба было вылазіць.

**Пакатаўшыся ў транспарце некалькі разоў, прыйшла да высновы, што на цяжарных рэагуюць і саступаюць ім месцы толькі жанчыны. Цікава, чаму?**

...Вырашыла змяніць транспарт: раптам у розных яго відах пасажыры паводзяць сябе па-рознаму? Падышла да трамвайнага прыпынку на плошчы Якуба Коласа. Тут заўсёды збіраецца шмат людзей. Прыехаў трамвай і вокамгненна запоўніўся. Я праціснулася паміж людзей і стала каля чатырох месцаў для сядзення, дзе камфортна размясціліся мужчына, жанчына сталага веку, яшчэ адзін малады мужчына, каля яго — спадарыня з вялікай колькасцю пакункаў. Пабачыўшы мяне, яна тут жа ўскочыла. Мне зрабілася няёмка: чалавек едзе загружаны, пасля працы і саступае мне, сімулянтцы, месца. Але побач я заўважыла маладога чалавека, які ўжо прагна паглядаў на сядзенне, што вызвалілася. Вырашыўшы, што жанчыне з пакункамі будзе менш крыўдна, калі месца займу я, а не ён, села.

Пакатаўшыся ў транспарце некалькі разоў, прыйшла да высновы, што на цяжарных рэагуюць і саступаюць ім месцы толькі жанчыны. Цікава, чаму? Напэўна, таму, што мужчына ніколі не адчуе на сабе, што значыць насіць пад сэрцам дзіця. Альбо можа быць іншая прычына. Напрыклад, адзін мой знаёмы заўсёды саступае месца жанчынам з жыватом. Ды часам выяўляецца, што яны не цяжарныя, а проста мажныя, і таму крыўдзяцца на хлопца. Але ж не хачу папракаць і раўняць усіх мужчын. Падчас адной з маіх «цяжарных» паездак малады чалавек у ваеннай форме ласкава прапусціў мяне ўперад пры ўваходзе ў трамвай, а таксама падаў руку, дапамагаючы на выхадзе. Вось што значыць гонар мундзіра!

### «Можа, у вас цыгарэта будзе?»

Апошнюю сваю «цяжарную» вылазку вырашыла зрабіць на рынак. Не варта і казаць, што ніякіх прывілеяў у выглядзе пропуску ў чарзе я не атрымала. Адзінае, што калі пераkладала пакупкі, прадавец са словамі «Дзетачка, давай я табе дапамагу!» патрымала мне сумку.

Узяўшы нагружаную гаспадарчую торбу ў адну руку і пакунак з напаўняльнікам для катоў у другую, рушыла на прыпынак грамадскага транспарту. Пакуль ішла, пераканалася, што дарэмна «паспадзявалася на нечую дапамогу. Цяжарная ты ці не, сама нагрузілася — сама і нясі.

Ужо каля дому да мяне падышла дзяўчына. «Няўжо яшчэ адна неабыякавая?» — спачатку ўзрадавалася я. Але ў адказ на свае думкі пачула: «Прабачце, можа, у вас цыгарэта будзе?..»



Фота Вольгі АЛІМАВАЙ.

### Цяжарнасць як загана?

Хапіла мяне на тры дні несапраўднай цяжарнасці. І гэта ўлічваючы, што па аб'ектыўных прычынах я не магла адчуць у поўнай меры ўсяго таго, што адчуваюць жанчыны ў такім становішчы. Але, паразмаўляўшы з некаторымі цяжарнымі жанчынамі і маладымі мамамі, пераканалася, што сутыкнулася з тэндэнцыяй.

— Многім усё роўна, якая ты — цяжарная ці кульгавая, — кажа Юлія Пракопчык, цяпер ужо шчаслівая мама пяцімесячнага Ігната. — Толькі два ці тры разы мне саступілі месца ў транспарце, а таксама адзін мужчына гадоў трыццаці — у банку. Жанчыны, асабліва ва ўзросце, увогуле глядзелі на мяне з нейкім дакорам, месца саступалі толькі маладыя дзяўчаты. Ствараецца ўражанне, што цяжарнасць — гэта нейкая загана. Але ёсць, вядома, і выключэнні.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

### КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

*— Безумоўна, неабходна дапамагаць цяжарным жанчынам, — пацвярджае загадчык 27-й жаночай кансультацыі г. Мінска Алена Нікалаева. — Яны — патэнцыйныя маці дзяцей, без якіх няма будучыні.*

*На думку Алены Нікалаевай, людзей, што зняважліва ставяцца да цяжарных жанчын, — адзінкі. А «гендарную» рэакцыю на цяжарных доктар тлумачыць тым, што жанчыны — істоты, якія імкнуцца даць любоў і пяшчоту, у той час як мужчыны больш агрэсіўныя.*

*— Не трэба скідваць з рахункаў, што ў жанчыны ёсць гармон прагестэрон — гармон цяжарнасці. Ён крыху мяняе псіхіку цяжарных жанчын: яны становяцца крыўдлівымі, плаксівымі, — дадае Алена Іванаўна. — Таму трэба быць у адносінах да цяжарных больш чуллівымі і ўважлівымі.*

*Рэзананс*

# ПРЫМУСІЦЬ ЦІ ЎСЁ Ж ДАЗВОЛІЦЬ?

**«Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прапануе ўзаконіць дзіцячую працу», «Беларускім школьнікам прапанавалі масціць тратуары» , «Хутка класці тратуарную плітку будуць школьнікі», «У Беларусі падлеткі будуць класці плітку», «БРСМ прапануе працаваць нават 14-гадовым школьнікам» — такімі загалоўкамі літаральна стракацелі беларускія і расійскія сайты. А падставай для чарговай інтэрнэт-«сенсацыі» стаў артыкул у «Чырвонцы», а дакладней, вырваная з кантэксту інфармацыя. Нагадаем, што ў нумары за 6 снежня быў змешчаны артыкул «І адпачылі, і зарабілі», прысвечаны падвядзенню вынікаў працоўнага семестра.**

У ім, у прыватнасці, паведамлялася пра прапанову БРСМ пашырыць пералік лёгкіх відаў работ, якія могуць выконваць асобамі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў, і дадаць у яго такія віды работ, як укладка тратуарнай пліткі, абкляйванне шпалерамі, фарбаванне паверхняў, догляд жывёлы і іншыя — усяго 39 пунктаў.

— Сучасныя падлеткі дастаткова добра фізічна развітыя, і, як сведчыць практыка, здольныя выконваць іншыя віды работ, якія, адпаведна, і аплачваюцца лепш, — абгрунтавала сваю пазіцыю другі сакратар ЦК БРСМ Альбіна Сычэўская.

Але ж розную інфармацыю можна прыпаднесці па-рознаму, што і зрабілі мае калегі-журналісты. Прывяду толькі некалькі іх цытат: «Краіне катастрафічна не хапае кадраў? Не бяда. Хутка на работу будуць браць нават падлеткаў. З ініцыятывай арганізацыі ўжо і школьных будатрадаў выступіў БРСМ. Там упэўнены, што 14-гадовы школьнік у стане сам зарабляць, прычым у тым ліку і кладкай тратуарнай пліткі...», «Падлеткі таксама павінны зарабляць — упэўнены функцыянеры ад БРСМ і прапануюць развіваць у краіне не толькі студэнцкія будатрады, але і школьныя».

Ці варта казаць, што і каментарыі ад наведвальнікаў інтэрнэт-форумаў пасыпаліся адпаведныя:

«А сам БРСМ ведае, як трэба класці плітку»?Гэта вам не даміно)))», «Прымусьце працаваць БРСМ!», «Пад «дазволіць» маецца на ўвазе «прымусіць» і г.д., і да т.п.

Шчыра кажучы, калі б сама не пісала пра тое, як падлеткі імкнуцца летам падзарабіць, але наймальнікі не хочуць звязвацца з непаўналетнімі, напэўна, кінулася б разам з усімі засмучацца наконт «эксплуатацыі дзіцячай працы». Але я цудоўна ведаю падлеткаў, якія гэтым летам шчыравалі на сезонных рынках грузчыкамі — падносілі кавуны. Або выносілі будаўнічае смецце. Зразумела, цалкам добраахвотна, бо за гэтую працу ім плацілі больш, чым іх бацькам. Тыя нават жартавалі, што, напэўна, і ім таксама трэба схаваць свае дыпломы і мяняць месца працы, бо, выконваючы некваліфікаваную работу, іх дзеці зарабляюць значна больш. Але быў адзін важны нюанс — падлеткі працавалі нелегальна, бо на такія віды работ афіцыйна дзяцей прыцягваць забараняецца. Да таго ж і не кожны наймальнік хоча ўсё афармляць па законе. Але ж задаволены былі ўсе — і падлеткі, якія зарабілі неблагія грошы, і наймальнікі, і нават бацькі, бо дзеці не сядзелі ўсё лета за камп'ютарам...

Трэба дадаць, што пэўны час таму была дапушчана іншая крайнасць: было забаронена прыцягваць школьнікаў нават... да вільготнага прыбірання ў класах і мыцця падлогі! Неяк у барацьбе за інтарэсы і правы дзяцей усе забыліся пра такое паняцце, як «працоўнае выхаванне». У мае школьныя гады, напрыклад, работа летам у працоўным лагеры была адной з умоў таго, каб цябе ўзялі пасля базавай школы ў старшы клас. Што толькі не даводзілася нам рабіць у калгасе: і палоць буракі (хоць у пустазеллі, якое было вышэй за мой рост, знайсці іх было даволі праблематычна), і працаваць з лапатай на зернетаку, дзе ўсе дыхальныя шляхі літаральна забівала найдрабнейшым пылам... Але чамусьці гэты досвед і сёння прыгадваецца з удзячнасцю...

А што давозіцца нярэдка сёння назіраць? Даклікацца на дапамогу дзяцей немагчыма. Нядаўна назірала, як бабуля фарбавала на могілках агароджу, а яе 15-гадовы ўнук-падлетак здзяйсняў у гэты час «экскурсію» па наваколлі. На маё пытанне, а чаму ж юнак не дапамагае, убачыла толькі сум у вачах немаладой жанчыны: «Бацькі так выхавалі...»

Дык ці варта ўсё ж такі падлеткам працаваць? Упэўнена, што цану заробленаму рублю, трэба ведаць яшчэ ў юнацтве. На шчасце, у інтэрнэт-прасторы знайшліся і мае аднадумцы:

*«Вось ужо навіна дык навіна !!! Я без усялякага БРСМ з 10 гадоў грошы зарабляў, а працоўная кніжка ў мяне — з 14!!! Хацеў мець уласныя грошы — і зарабіў! А зараз толькі і чую: «Дай, дай, дай».*

*«А што дрэннага? Прымусам жа дзейнічаць не будуць. Я ў 14 гадоў быў рады любой магчымасці пайсці куды-небудзь падзарабіць»*

*«Я з 12 гадоў кароў пасвіў! І што? На зернетаку з восьмага класа ў начныя змены з аднакласнікамі зерне «лапаціў»! А зараз малодшая дачка ў педагагічны на першы курс паступіла і заяўляе: «Тата, купі мне хоць бы аднапакаёўку, я хачу асобна жыць».*

*«Калі ў дзяцей ёсць жаданне працаваць — то на здароўе, галоўнае — каб не было прымусу».*

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 12 2012 г.

# «ПЕСНЯ — ЯК ДЗІЦЯ, ЯКОЕ НАРАДЖАЕЦЦА, КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ЯГО ЧАС»



Юзары з маці Галінай Грамовіч, салісткай канцэртнага аркестра пад кіраваннем М. Фінберга.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Скажы, гэта неяк адбіваецца на тваіх жыццёвых устаноўках?**

— Да прыкладу, я не ўжываю мяса. Зараз поўнасцю пераходжу на іншы рацыён. Мне неяк трапіліся цікавыя ролікі, дзе тлумачыцца, што ежа — гэта бізнэс і як ён робіцца. Пасля ўбачанага, перш чым замовіць нейкую страву, пракручваю гэтыя кадры ў галаве. Я параўноўваў стан, калі ясі мяса і калі абыходзішся без яго. Паверце, розніца існуе. Гэта простая звычка, ад якой не кожны можа адмовіцца.

**— У сваёй творчасці ты часта эксперыментуеш. Гэта твой спосаб пошуку і прасоўвання сябе?**

— Заўсёды і вельмі шмат эксперыментую. Былі моманты, калі я выходзіў за нейкія рамкі, бо хацеў ведаць сутнасць тых ці іншых рэчаў. Я так заўсёды дзейнічаю: спрабую нешта, а потым гляджу, патрэбна мне гэта ці не. **Не раз я біўся на вуліцы, спрабаваў курыць, каб зразумець, навошта гэта людзям.** Таксама эксперыментую з рэпертуарам. Ва ўніверсітэце кожны год да іспыту я рыхтаваў нешта новае, што адкрываў для сябе, хоць у нас дзейнічае ўмова — экзамен павінен насіць джазавы характар. Але да мяне ставяцца з разуменнем, і мяне гэта радуе. Так я магу зведаць нешта новае.

**— Якая атмасфера студэнцкага жыцця ў Піцеры?**

— Студэнцкае жыццё я адчуваў толькі на першым-другім курсе, а потым пачалася праца. Але я ведаю, як жыць у інтэрнаце. Сам універсітэт размешчаны ў двух палацах, аб'яднаных паміж сабой. Калі я паступаў туды, то мой дзед мне казаў: «Вось цяпер, Юзары, ты будзеш сніць усе тыя калідоры, якія я бачу ў сне ўсё жыццё». Там планіроўка будынка абсалютна не паддаецца логіцы, нагадвае лабірынт. Калі называюць месца, дзе будзе праходзіць лекцыя, то ў думках пачынаеш пралічваць, як туды трапіць. І сапраўды, тыя хады я зараз пачынаю бачыць у снах.

**— Раскажы пра свой вопыт напісання музыкі да пластычнага спектакля «Двое»...**

— У школе я навучаўся ў класе з тэатральным ухілам. Мы былі эксперыментальным класам. За два гады прайшлі ўвесь курс Шчукінскага вучылішча. Потым скончылі школу, і нас раскідала па свеце. Вось мой сябар Арцём (у яго псеўданім D`Arti) застаўся тут. Ён па характары дзеянняў мім, які ўсміхаецца са слязой на вачах. Мне сімпатычны гэты стыль. Мы даўно хацелі зрабіць нешта сумесна, таму, калі Арцём расказаў мне пра сваю задуму, я прапанаваў яму сваю музыку. Мяне зацікавіў гэты жанр, бо там усе свае эмоцыі ты перадаеш целам, а астатняе дадумваеш. Летам спектакль будзе прадстаўлены на конкурсе, і я з нецярплівасцю чакаю ацэнкі. З аднаго боку, я радуюся поспехам сябра,



З сябрамі-музыкантамі праекта UZARI

а з іншага, таксама маю да гэтай творчасці непасрэднае дачыненне. Мне цікава было аддаць сваю музыку ў іншыя рукі і назіраць, што будзе з ёй далей.

**— Напярэдадні Новага года ў якіх праектах зможам цябе ўбачыць?**

— АНТ здымае «Навагоднія вечары». Там я з гуртом «Ямайка» буду спяваць дуэтам. Я перарабіў песню «Афрыка» Сімона Хафанана. Усё: і тэкст, і структуру, і аранжыроўку. Толькі зводзіў не я. Атрымаўся своеасаблівы мікс «кучаравых». Хачу спадзявацца, што будзе цікава. Таксама мяне можна будзе ўбачыць у навагоднім выпуску праграмы «Месца сустрэчы» на тэлеканале «Беларусь 1».

**— А сам як будзеш адзначаць Новы год?**

— На Новы год вельмі хочацца пабыць з сям'ёй. Але адчуваю, што з-за прафесійных момантаў гэта можа і не атрымацца, хоць карпаратывы для мяне рэдкасць. У Піцеры для мяне Новы год заўсёды праходзіў на сцэне: то я ў канцэрце ўдзельнічаў, то ў мюзікле выступаў. Зараз усё ж такі хочацца пабыць з роднымі.

**— Верыш у цуды?**

— Цуды залежаць ад нас саміх. Для мяне цуд — гэта калі чалавек здольны падняцца пасля падзення і ісці далей. Я ў біяграфіях многіх знакамітых людзей назіраў гэтую тэндэнцыю. Узяць таго ж Бетховена, які страціў слых, але працягваў ствараць музыку.

**— А якое гучанне надае музыка твайму жыццю?**

— Музыка — гэта, у пэўным сэнсе, залежнасць. Калі я на сцэне, то прагну размаўляць са слухачамі на мове сваіх песень. Магчыма, нехта палічыць мяне за вар'ята, але музыка ўмее размаўляць. Да кожнай песні я стаўлюся як да дзіцяці, якое нараджаецца, калі прыходзіць яго час. Калі ты не дазволіш гэтаму здзейсніцца, то ты злачынец. Я рады, што разумею мову музыкі і магу дзяліцца гэтым сваім дарам з іншымі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Іны АЛЬШЭЎСКАЙ.**

*Свая справа*

# ДЗЯЎЧЫНА «Ў ШАКАЛАДЗЕ»

## ШУКАЕШ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА? СТВАРЫ ЯГО САМ!

**Атрыманне вышэйшай адукацыі дзеля дыплома — з'ява сёння не такая і рэдкая. Асабліва гэта датычыцца эканамічных і юрыдычных спецыяльнасцяў. Далёка не ўсе студэнты накіроўваюцца потым са сваім дыпломам на працу па абраным профілі.**

**Але выпускніца БДЭУ Марыя КУХАРЭНКА — яскравы прыклад таго, як, маючы дыплом і пэўны багаж ведаў, можна стварыць сабе працоўнае месца... ўласнымі рукамі.**

Фігурнага шакаладу ў Беларусі да нядаўняга часу было не так шмат. Выпраўляць гэтую сітуацыю і вырашыла наша гераіня. Сёлетняя выпускніца «наргаса» стварыла ўласны праект па развіцці фірмы, якая займаецца выпускам шакаладу ў розных формах. Сёння праект стаў рэальнасцю, і кожны можа набыць сабе салодкі сувенір ў выглядзе падковы, набору інструментаў ці, напрыклад, рэвальвера ў інтэрнэт-краме.

Крама пачала працаваць яшчэ тады, калі Марыя была студэнткай. Яна сама склала бізнэс-план і даказала інвестарам яго вартасць. Сутнасць справы простая: прывозіцца шакалад, яго растопліваюць і заліваюць у прыгожыя формы. У выніку маленькая фірма Машы Кухарэнкі заняла вялізную нішу, якая пуставала.

Мы звязаліся з Марыяй, каб даведацца, ці прыносіць яе «шакаладная» справа дастаткова сродкаў, а таксама атрымалі некалькі парад для тых, хто плануе пачаць сваю справу. Інтэрв'ю «Звяздзе» Марыя давала праз электронную пошту, бо перад Новым годам краму, па яе словах, «завалілі» заказамі.

**— Што падштурхнула заняцца ўласным бізнэсам? Чаму ты не пабаялася рызыкаваць?**

— У мяне бацькі прадпрымальнікі, таму выбар наконт уласнага бізнэсу быў зроблены даўно, заставалася толькі знайсці добрую ідэю. Для гэтага я наведвала шмат розных курсаў і, у рэшце рэшт, прыйшла ў бясплатную школу інтэрнэт-бізнэсу для пачаткоўцаў. Рызыка няўдачы ёсць заўжды. Іншая справа, ці сапраўды гэтая рызыка вялікая. У маім выпадку яна была мінімальнай.

**— Чаму менавіта фігурны шакалад? Ты аналізавала рынак самастойна?**

— Такога роду бізнэс, вядома, мае свае нюансы, але і попыт на тавар ёсць заўсёды. Аналіз рынку заняў 40% майго бізнэс-плана. Я працавала сама, але схему аналізу ўзяла на занятках у школе інтэрнэт-бізнэсу.

**Сутнасць справы простая: прывозіцца шакалад, яго растопліваюць і заліваюць у прыгожыя формы. У выніку маленькая фірма Машы Кухарэнкі заняла вялізную нішу, якая пуставала.**

**— Ці хапіла ведаў, атрыманых у БДЭУ?**

— Мне пашанцавала: я паступіла менавіта на тую спецыяльнасць, якая пазней спатрэбілася для бізнэсу («Эканоміка і кіраванне ў АПК»). У нас нават выкладалі інвестыцыйнае праектаванне, якое вельмі спатрэбілася пры складанні бізнэс-плана праекта. Тыя веды, якія не ўваходзілі ў праграму навучання, я атрымлівала на розных курсах. У прыватнасці, цікавілася маркетынгам і паводзінамі спажыўца.

**— Хто дапамагае ў рэалізацыі самога праекта?**

— Дапамагаюць усе, нават кліенты. Заўсёды распавядаюць, што і дзе з'явілася новага і цікавага. Таму я заўсёды ў курсе ўсіх «шакаладных навінак».

**— Праект так і працягне існаваць у інтэрнэце, ці вы збіраецеся адчыніць рэальную краму?**

— Так, плануем адкрыць невялікую рознічную краму ў наступным годзе.

**— На якім этапе бізнэс стаў прыносіць прыбытак?**

— Акупляцца крама стала ўжо праз тры месяцы пасля адкрыцця. Інтэрнэт-сайт дае сезонны даход, звычайна перад святамі, а вось улетку шакалад чамусьці не карыстаецца попытам.



**— Ці можаш даць некалькі парад тым, хто таксама вырашыў пачаць свой бізнэс?**

— Парада першая: знайсці кліентаў трэба яшчэ да таго, як пачынаеш укладаць грошы ў бізнэс. Парада другая: большую частку павінны складаць выдаткі, звязаныя з задаволенасцю спажыўцоў (якасць, камфорт, эстэтычнасць, хуткасць).

Парада трэцяя: ніколі нельга працаваць па старых тэхналогіях, таму што толькі ў працэсе імправізацыі і нараджаюцца геніяльныя ідэі. Напрыклад, звычайна ўсе кандытарскія фабрыкі робяць шакаладныя фігуры з глазуры, а мы шляхам доследу навучыліся рабіць іх з шакаладу. Гэта значна даўжэй па часе, але і смачней. Парада чацвёртая: стаўце вялікія мэты!

**— Хто вашы асноўныя кліенты? Ці ўжываеш сама свой шакалад?**

— Асноўныя кліенты нашай крамы — жанчыны ва ўзросце ад 20 да 35. Гатовыя фігуры з шакаладу я сабе ніколі не пакідала, а вось нашы цукерачкі (мы гандлюем яшчэ і цукеркамі ручной работы) вельмі люблю!

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

**Шакаладныя вырабы ад Марыі...**



*У прадчуванні*

# ВОСЬ ТВАЯ ХАТА, А Ў ЁЙ — СВЯТА!


Таня.

**СТАІЎШЫ подых, мы чакаем Новага года. З хваляваннем, прыемнымі клопатамі і традыцыямі. Столькі ўсяго трэба паспець! І пра гасцінцы не забыцца, і хату ў парадак прывесці, і ўпрыгожыць яе належным чынам. Як арыгінальна і густоўна ўпрыгожыць сваю кватэру да Новага года, расказалі аматарка рабіць «хэнд-мэйд»-штучкі Таня ДЗЯЛЕНДЗІК і малады дызайнер Лена КУЛІНКОВІЧ.**


Лена.

***— Дзяўчаты, прывітанне! З чаго пачаць адну з самых важных навагодніх спраў — упрыгожванне кватэры? Лена, ёсць ідэі?***

**Л.К.:** — Вядома. Пачаць варта з галоўнага сімвалу — ёлкі! І тое, неабавязкова традыцыйнай натуральнай ці штучнай. Можна зрабіць больш цікава і ўпрыгожыць хатнюю расліну: фікус, пальму. І іголкі не скіне, і стаяць будзе доўга *(смяецца)*. Падрыхтаваць сімвалічнае дрэва нескладана і самастойна, напрыклад, з мішуры! Усё проста. Робіш з кардону акуратны конус патрэбнага табе памеру. І па спіралі, пачынаючы з верхавіны, наляпляеш мішуру.

Хораша выглядаюць папяровыя ялінкі, зрабіць якія таксама не складзе адмысловай працы. Для гэтага трэба выразаць з кардону вось такія нарыхтоўкі *(фота 1)*, а


1.

потым сагнуць кожную такую ялінку напалову. Склеіць часткі паміж сабою. Для хараства такія ялінкі можна зрабіць карункавымі, выразаўшы па прынцыпе «сняжынак» на нарыхтоўках узоры.

***— Таня, а што можаш падказаць ты?***

**Т.Д.:** — Ёсць і іншыя спосабы зрабіць папяровую ялінку. За аснову бярэцца ўсё той жа кардонны конус. З каляровай ці абгортачнай паперы наразаецца вялікая колькасць палосак, аднолькавых па шырыні і даўжыні. Кожную палосачку склейваем клеем, каб атрымалася акуратная гафтачка. Адразаем па дыяметры конуса кавалак ільняной тканіны, на які лепяцца нашыя гафтачкі. Мацуем гэты шэраг да конуса. Робім некалькі такіх палосак з кавалка льняной тканіны, пакуль конус не стане «пухнатым» *(фота 2)*.


2.

Эфектна выглядае «лускаватая» ёлка. На кардонны конус наляпляюцца шматкаляровыя папяровыя кружочкі аднаго памеру *(фота 3)*.


3.

**Класіка — гэта добра, але ёсць сотні іншых спосабаў упрыгожыць нашу зімовую красуню.**

***— Выдатна! Дэкаратыўныя ялінкі-падробкі мы падрыхтавалі. А як упрыгожыць галоўную ёлку?***

**Л.К.:** — Чаго не люблю, так гэта прымітыўнасці мыслення: калі ёлка, дык абавязкова ў шарах і мішуры. Класіка — гэта добра, але ёсць сотні іншых спосабаў упрыгожыць нашу зімовую красуню. Таня, як ты збіраешся ўпрыгожыць ёлку сёлета?

**Т.Д.:** — Па свежыя ідэі, увогуле, мы да цябе, Лена, і прыйшлі *(смяецца)*. А калі сур'ёзна, у маім пакоі будзе стаяць маленькая ялінка на стале. Я збіраюся прыбраць яе ў колеры надыходнага года Змяі — гэта белы, блакітны і сіні. Ужо купіла белыя агеньчыкі. Сама самаробнічаць люблю. Таму з пацерак сплята некалькі блакітна-белых фігурак змеек, шароў. І яшчэ некалькі ўпрыгажэнняў звязала ў выглядзе карунак і геаметрычных фігур. Атрымалася вельмі хораша.

А ў падарунак сяброўцы зрабіла ўпрыгажэнні з пёраў. З некалькіх яркіх пёрак сабрала пучок. Для падвешвання будучай цацкі прычапіла гафтачку з тасьмы. На нітку ў тон пёрам нанізала буйную бубку, падвесіла яе да пучка. Такіх віслых пацераў павінна быць некалькі. Вось і ўсё, у прынцыпе. Яшчэ можна такі пучок з пёраў прымацаваць на звычайны ёлачны шар, тым самым зрабіўшы яго арыгінальней.

**Л.К.:** — Цікавае вырашэнне, што тут скажаш! Я ж магу параіць зрабіць цацкі з... шышак! Для гэтага патрэбны самі шышкі, залатая ці сярэбраная пудра, лак па дрэве, канцылярскія сашчэпкі і пэндзаль, якія не шкада. У асобным посудзе перамяшаць лак з пудрай. Потым атрыманай фарбай пакрыць шышкі. Добра прасушваем. На верхавіны шышак мацуюцца сашчэпкі, за якія потым і вешаем іх на ёлку *(фота 4)*.


4.

Сімпатычнае ўпрыгажэнне можна зрабіць і са звычайнай лямпы напальвання. Бяром лямпачку, фарбуем яе ва ўпадабаны колер. І, пакуль яна сохне, робім штучны снег — ім упрыгожым лямпачку. Змешваем звычайную муку і клей ПВА, якія перамешваюцца да атрымання аднастайнай масы. Наносім «снег» пэндзлем на верх лямпачкі. Потым робім прыгожы контур. Наносім фламастарам разметку будучага абадка. Бяром соль і чорную фарбу, змешваем. Перакладаем гэтую масу ў поліэтыленавы пакет і на яго кончыку робім дзірачку. Ледзь націскаючы на пакет, малюем контур на лямпачцы. Як высахне абадок, наносім бясколерны лак для пазногцяў на месцы, дзе будуць бляскі. Пасыпаем імі лямпачку. Каб схаваць цокаль лямпачкі, зробім яму «спаднічку». Выразаем з тканіны некалькі палосак: ад шырокіх да вузкіх. Пры накладанні яны будуць «выглядваць» адна з-пад адной. Палоскі паміж сабой злучаем стэплерам ці ніткамі. Злучаем канцы. Гэтую «спаднічку» насоўваем на цокаль. Пры дапамозе прыгожай тасьмы фіксуем тканіну на лямпачцы. Арыгінальны шар гатовы!

***— Але і памяшканне ўпрыгожыць таксама трэба... Таня, што думаеш?***

**Т.Д.:** — На мой погляд, другі па значнасці сімвал Новага года пасля ёлкі — гэта святочны стол. Яго без увагі таксама пакінуць нельга, бо за сталом звычайна і праводзяць першыя хвіліны Новага года. Мне даспадобы свечкі, я раблю прыгожыя падсвечнікі для іх сама. Напрыклад, з фужэраў. Арыгінальна? Дзіва што! Тут варта даць волю сваёй фантазіі на ўсе сто адсоткаў: фужэр можна і распісаць фарбамі, і ўпрыгожыць бліскаўкамі, пацерамі, карункамі — чаго душа пажадае. Пасля гэтага ёмістасць трэба перавярнуць. І на ножку, якую, дарэчы, можна ўпрыгожыць стужачкай, паставіць круглую свечку.

***— Лена, а ў цябе ёсць некалькі дызайнерскіх сакрэтаў для ўрачыстага стала?***

**Л.К.:** — Стварыць святочны настрой вялікая ваза для садавіны, напоўніць якую трэба навагоднімі шарамі *(фота 5)*. Гэта не складана, затое выглядае фантастычна, ужо паверце! Дарэчы, у вазу па перыметры можна скласці некалькі яловых галінак. Гэта надасць характэрны іглічны пах, упрыгожыць стол, і іголкі не будуць рассыпацца ў стравы. Сурвэткі таксама можна арыгінальна аформіць, склаўшы іх у прыгожыя кольцы. Падыдуць нават кольцы для штор, толькі іх трэба папярэдне расфарбаваць, абвіць стужачкай ці ўпрыгожыць бліскаўкамі. Ці проста акуратна павязаць на сурвэткі бантыкі.


5.

***— Месца, дзе будзем сустракаць гасцей, упрыгожылі. А яшчэ што? Таня, падзяліся думкамі на гэты конт.***

**Т.Д.:** — Першае, што пабачаць вашыя госці — гэта дзверы. Зрабіце прыгожы калядны вянок і павесьце на іх. З той жа мішуры, шышак ці маленькіх шарыкаў. Як па мне, велізарная мішура і «дожджык» на сценах кватэры не патрэбны. Гэта мода ўжо пайшла ў мінулае. Куды прыгажэй выглядаюць пераліўныя гірлянды ці вялікія шары.

**Вераніка ЗЛОБІЧ.**

# А ПАШТОЎКІ Ў МОДЗЕ ЗНОЎКУ!

**Сёння, калі «скайп» злучае чалавека з любой кропкай планеты, а паведамленні ў сацыяльных сетках ляцяць не больш за секунду, цяжка сабе ўявіць, што павіншаваць са святам можна звычайнай паштоўкай. І яны, як мяркуюць некаторыя, не памерлі ў бабуліных куфарах. Пачуццё радасці, дрыжыкаў ад атрымання каляровай паштоўкі па-асабліваму могуць адчуць тыя людзі, якія з'яўляюцца аматарамі новага сусветнага руху — посткросінгу.**



Гэта праект, які дазваляе абменьвацца менавіта папяровымі паштоўкамі з розных пунктаў Зямлі. Пры гэтым у посткросінгу дзейнічае сістэма непрамога абмену: удзельнік адпраўляе паштоўку адным карыстальнікам, а атрымлівае ўжо зусім ад іншых. Нарадзіўся праект у Партугаліі. Менавіта там была адпраўлена першая паштоўка.

Як жа працуе сістэма посткросінгу? Для пачатку трэба зарэгістравацца на сайце www.postcrossing.com. Пасля гэтага вам даецца адрас выпадковага посткросера з любой краіны, якому вы павінны даслаць паштоўку. Пры гэтым адваротны адрас не пішацца, замест яго трэба пазначыць спецыяльны код (напрыклад, BY-19568). Пасля таго, як набудзеце паштоўкі і маркі, можаце накіроўваць сваё пасланне. Як толькі ваш адрасат атрымае паштоўку, ён павінен зарэгістраваць яе на сайце. Адначасова сістэма абярэ з мноства іншых менавіта ваш адрас, і калі-небудзь вы станеце шчаслівым уладальнікам паштоўкі, якая прыйдзе, напрыклад, з Бразіліі ці Кітая. Як толькі адну з дасланых вамі паштовак зарэгіструюць (пра гэта вам паведаміць электронная пошта), можна рыхтаваць наступную.

Актыўна распаўсюджваецца посткросінг і ў Беларусі. **Ксенія ТАРАСЕВІЧ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ,** выказала сваё меркаванне наконт папулярнага праекта:

— Посткросінгам стала захапляцца з вясны гэтага года. Я доўга не асмельвалася зайсці на сайт і зарэгістравацца, але ў маі нарэшце рашылася стаць адным з носьбітаў ганаровага звання — посткросер. Як толькі атрымала свае першыя пяць адрасоў, адразу пабегла набываць паштоўкі. Першая краіна, у якую я паслала папяровае пасланне, — Нідэрланды. Зараз, апроч яе, часцей за ўсё адсылаю паштоўкі ў Германію, Расію, Кітай. Магчыма, гэта звязана з тым, што гэтыя краіны з'яўляюцца лідарамі па колькасці посткросераў.

У посткросінгу мяне прываблівае магчымасць даведацца пра культуру розных краін. На паштоўках неабавязкова адлюстраваны помнікі архітэктуры ці ландшафт. Гэта могуць быць і героі казак, і выявы з элементамі нацыянальных танцаў. За невялікі тэрмін я ўжо зразумела, што посткросінг — гэта больш, чым каляровыя паперкі. Гэта магчымасць даволі-такі незвычайным спосабам даведацца пра пэўную краіну і захаваць гэтую частачку ведаў у шуфлядзе пісьмовага стала на ўсё жыццё.

**Вікторыя ЧАПЛЕВА.**

## На конкурс «Новы погляд»

НАГАДАЕМ, што гэты конкурс — не для пасрэдных аўтараў, здольных хіба што на прымітыўнае інтэрв'ю з пытаннямі накшталт «Ну што ў вас новенькага?». Ён — для тых, хто хоча палюбіць журналістыку ўсур'ёз і надоўга: для неабыякавых, няўрымслівых, энергічных і крэатыўных. Для патэнцыяльных студэнтаў факультэтаў журналістыкі і будучых аўтараў «Чырвонкі»... Ад удзельнікаў конкурсу пад назвай «Новы погляд» мы чакаем не банальныя тэксты, а артыкулы з прэтэнзіяй на... На геніяльнасць. На адкрыцці. На арыгінальнасць... Не будзем працягваць, паставім шматкроп'е. Далей — справа за вамі!

Траіх пераможцаў конкурсу, які будзе доўжыцца да 1 мая 2013 г., чакаюць прызы. Лепшы атрымае ад рэдакцыі накіраванне для паступлення на факультэт журналістыкі ВНУ. Дасылайце свае «пробы пяра» на адрас «Звязды» (у тым ліку і электронны) з абавязковай паметкай: на конкурс «Чырвонка». Новы погляд». Памер артыкула — у межах разумнага.

# СТАРАСТА КЛАСА — ТАНЯ...

## Сёння, каб стаць лідарам, яна павінна была б быць модніцай і ньюсмекерам?

**Калісьці мая настаўніца англійскай мовы, ужо немаладая жанчына, распавяла на ўроку цікавую гісторыю: яшчэ ў савецкія часы ёй давялося ўзяць класнае кіраўніцтва ў сямікласнікаў. Клас быў не асабліва ўзорны — хутчэй, наадварот, хуліганаў больш, чым выдатнікаў. У першы дзень вучобы яны ўсім класам выбіралі старасту. «Я чакала, што дзеці вылучаць каго-небудзь са здаравякоў-хлопцаў, але старастай усе аднагалосна прызналі маленькую акуратную дзяўчынку, якая сядзела за першай партай, — расказала настаўніца. — Спачатку я падумала, што яны проста вырашылі скінуць адказнасць за клас на гэтую кволую выдатніцу, але пазней пераканалася, што ўсё далёка не так проста. Таня — так звалі старасту — сапраўды была лідарам класа, ды яшчэ з такім аўтарытэтам, які многім і не сніўся. Яна «падцягвала» двоечнікаў, але спісваць сама нікому не давала і сачыла, каб гэта не рабілі іншыя; шпаргалкі і «рагаткі», карты і цыгарэты — усё, забароненае ў школе, яна адбірала ў аднакласнікаў, варта было ёй толькі заўважыць «доказ», які тырчаў з кішэні, ці адчуць пах тытуню. «Віноўныя» беспярэчна здавалі сваё «дабро». Ніхто не адважваўся ні слова насуперак сказаць гэтай мілай дзяўчынцы з кароткімі касічкамі. Маленькую Таню з яе арганізатарскімі здольнасцямі не ненавідзелі, а любілі».**

— Я чатыры гады назірала гэтую дзіўную анамалію. Да самага выпуску Таня не страціла свайго аўтарытэту, — падвяла вынік Любоў Сяргееўна. — Калі яны заканчвалі дзясяты клас, я спытала ў яе, чаму менавіта яна стала лідарам, спадзеючыся, што дзяўчына раскрые мне нейкую таямніцу. Але Таня толькі пацiснула плячыма і ўсміхнулася ў адказ: «Я сама не ведаю. Прыйшла ў гэтую школу ў пятым класе і спачатку не магла прыжыцца сярод іх: у папярэдняй школе наш клас быў узорным. Стала спрабаваць нешта растлумачыць новым аднакласнікам, хацела дапамагчы ім — і яны сталі мяне слухаць. Можа, мае паводзіны былі нейкай нечаканасцю: не ўсякая «маляўка» адважыцца нападаць на хуліганаў. А, можа, мне проста пашанцавала». Дзіўная гэта была дзяўчынка — з асаблівым дарам.

**Тады на першым плане стаяў калектыў, людзі ў агульных справах, калектыўныя інтарэсы, цяпер — асобны чалавек з яго патрэбамі і жаданнямі. Індывідуалізм і ў нейкай ступені нават адзінота ўвайшлі ў моду: думаю, амаль кожны зараз хоча самастойна прымаць рашэнні, дзейнічаць на карысць сабе.**

У наш час старасты — рэдка лідары ў сваіх класах. Цяпер староста, хутчэй, проста службовая асоба, якая абавязана прымушаць сваіх аднакласнікаў захоўваць дысцыпліну, і вялікім аўтарытэтам такія «афіцыйныя лідары» пахваліцца могуць рэдка. Чаму? Напэўна, уся справа ў тым, што цяпер каштоўнасці ў моладзі зусім іншыя, чым тады. Каго сёння хвалююць піянерскія гальштукі, збор макулатуры, паспяховасць і гонар класа? Калі адказваць шчыра — практычна нікога.

Дык можа, сёння справа ўжо за нефармальнымі лідарамі — верхаводамі тусовак, дваровых кампаній, скейтараў, ралевікоў, любых іншых груп падлеткаў, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі? У пошуках «героя нашага часу» азіраюся ў сваім асяроддзі, спрабую выпытаць у сяброў: ніхто чамусьці не можа прывесці прыкладу, як нехта з аднагодкаў заваяваў аўтарытэт, пераўтварыўшыся з «радавога» члена кампаніі ў яе «капітана».

Высновa просіцца толькі адна: лідар сённяшняй моладзі не патрэбны. Чаму? Адна з галоўных прычын, памойму, у тым, што цяперашняе грамадства карэнным чынам адрозніваецца ад таго, у якім жыла дзяўчынка Таня. Іншая ідэалогія, іншыя мэты, іншыя погляды. Тады на першым плане стаяў калектыў, людзі ў агульных справах, калектыўныя інтарэсы, цяпер — асобны чалавек з яго патрэбамі і жаданнямі. Індывідуалізм і ў нейкай ступені нават адзінота ўвайшлі ў моду: думаю, амаль кожны зараз хоча самастойна прымаць рашэнні, дзейнічаць на карысць сабе.

Ды і быць лідарам у наш час — такім, каб цябе не адхілілі — значна больш складана, чым гадоў трыццаць таму. У тыя часы тыповы староста — гэта выдатнік, «камсамолец, спартсмен і проста прыгажун». Харызматычны чалавек, які ўмее пераконваць і валодае аўтарытэтам.

А хто ж моладзевы лідар сёння? Наогул, гэта — асобная гісторыя. У падлеткаў свая псіхалогія, з уласнай іерархіяй і часта дзіўнымі законамі, прыстасоўвацца пад якія бывае складана. Відавочна, нашмат больш складана, чым тады.

Безумоўна, лідар павінен умець весці за сабой людзей, пераконваць іх, заражаць сваімі ідэямі. Прымуса — не той метад, якім можна дамагчыся добрых вынікаў у любой справе, таму сапраўдны лідар павінен умець заўсёды паводзіць сябе так, каб і астатнім было цікава пайсці за ім.

Але адной харызмы мала, трэба яшчэ і безумоўнае вяршэнства па нейкім пункце. І калі раней крытэрыем часта выступалі адны «пяцёркі» ў дзённіку, зараз імі мала каго ўразіш. У дваровай хлапечай кампаніі лідарам, хутчэй за ўсё, стане самы моцны фізічна, той, хто можа абараніць сваё права быць «важаком», а яшчэ, напрыклад, самы забяспечаны. У дзявочай тусоўцы на першы план выйдзе тая, якая лепш за ўсё разбіраецца ў модзе або мае самы «круты» гардэроб. У любым выпадку, лідарам стане той, хто ідзе на крок наперадзе за іншых. Вось і яшчэ адна якасць сучаснага лідара — інфармаванасць, без яе нікуды.

Але ці здолее лідар доўга быць галоўным, калі будзе штодня паказваць сваю перавагу перад іншымі? Для моладзевага верхавода важна быць блізкім да сваёй групы. А калі ён стане пры кожным зручным выпадку дэманстраваць сваё вяршэнства — шмат каму гэта не спадабаецца і лідар страціць давер.

У сучасных падлеткаў і моладзі, зноў жа, у адрозненне ад дарослых, ёсць патрэба ў самасцвярджэнні, жаданне вылучыцца з агульнай масы. Такім чынам, моладзевы лідар сам павінен быць яркім, смелым, упэўненым у сваіх словах і ўчынках. Павінен не баяцца апраўдана рызыкаваць, умець выйграваць і пераконваць усіх членаў сваёй групы ў тым, што яны ідуць па правільным шляху.

**У дзявочай тусоўцы на першы план выйдзе тая, якая лепш за ўсё разбіраецца ў модзе або мае самы «круты» гардэроб. У любым выпадку, лідарам стане той, хто ідзе на крок наперадзе за іншых.**

Яшчэ важна разумець сваіх сяброў. Лідар, які не разбіраецца ў тым, чым цікавіцца яго кампанія, наўрад ці зможа ўтрымаць пазіцыі.

І ўсё ж такі, нават падчас культу індывідуалізму, лідар павінен умець падпарадкоўваць іншых сабе. Гэта важна асабліва з падлеткамі, якія ва ўсе часы жылі па схеме «буду рабіць, што хачу, калі хачу, і як хачу», бо лідар — не проста цэнтральны персанаж якой-небудзь групы людзей — ён яшчэ і той, хто ёю кіруе. А без гэтага навыку быць добрым «важаком» наўрад ці ўдасца...

**Кацярына ЖОРАВА, вучаніца 11-га класа Ліцэя БДУ.**

## Зрэз

# ДЗЕЦІ «ЖЫВУЦЬ» У СЕЦІВЕ

## Але будучыня іх хвалюе больш за «шмоткі»

**Ці памятаеш, паважаны чытач, што цябе цікавіла ў 14-16 гадоў? Якія праблемы хвалявалі? Вось мяне, напрыклад, цікавілі тры рэчы: баскетбол, гітара і... дзяўчаты. Хаця, не — тады дзяўчаты былі на першым месцы! А хвалявала, куды і як паступіць, і як справы ў маіх родных.
А што цікавіць сённяшніх 14-16-гадовых юнакоў і дзяўчат? Што іх турбуе, якія праблемы хвалююць?
Гэтыя пытанні я задаў 18 юнакам і дзяўчатам, якія прыехалі з усёй Беларусі ў Рэспубліканскі дзіцячы пульманалагічны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Баравое» ў курортным пасёлку Нарач, дзе я працую выкладчыкам.**

Дзеці адказвалі ананімна. Часу, каб падумаць, я даў дастаткова. Таму лічу, што напісанае — праўда. Калі прааналізаваў адказы, атрымалася вось што.

Найбольш папулярным стаў адказ «праводзіць час у інтэрнэце»: меліся на ўвазе сацыяльныя сеткі, анлайн-гульні, сайты знаёмстваў. Так напісалі 10 рэспандэнтаў (55%).

На другім месцы адказ «цікава бавіць час з сябрамі» — 7 чалавек (або 39%). На трэцім «дыскатэкі/клубы/кінатэатры» — 5 (або 28%). Далей размясцілася «гітара», якая цікавая 3 з апытаных (або 16%). «Спорт» і «мода» цікавяць 2 школьнікаў (або 11%). Здзівіла мяне, што «сям'я/кнігі» вабяць усяго па 1 чалавеку.

Больш за ўсё — 6 падлеткаў (або 33%) — хвалюе «будучыня». Следам ідзе адказ «супрацьлеглы пол» і «няякасныя «шмоткі» — па 4 (ці 22%).

2 (або 11%) турбуе, што школьнікам пасля 22.00 нельга знаходзіцца на вуліцы без дарослых. Такі ж працэнт рэспандэнтаў хвалююць цэны. Па 1 (ці каля 2%) маладых людзей хвалюе «канец свету, прызначаны на 21 снежня» і «чаму людзі такія злыя».

Гэта найбольш папулярныя адказы. Але хочацца вылучыць асобныя адказы. Працытую іх у арыгінале.

*«Хвалюе тое, што некаторыя краіны, прыкрываючыся «дэмакратыяй», дзеля сваёй выгоды, робяць усё, каб устанавіць кантроль над астатнімі, слабейшымі за іх дзяржавамі. Хвалюе праблема Расіі. За рулём некалі вялікай краіны стаяць зладзеі і ашуканцы. І самае галоўнае — яны не проста закрываюць вочы на праблемы сучаснага расійскага грамадства, а робяць выгляд, што гэтых праблем няма. Відаць, гэта ім выгадна...»*

Ці вось яшчэ: *«Калі адказваць сур'ёзна, больш за ўсё мяне трывожыць дэградацыя грамадства. Усё часцей сустракаю людзей, у якіх галоўная праблема наступная: «Што мне напісалі ў «Кантакце...»*

І — напрыканцы: *«Мяне хвалюе сучасная моладзь і яе будучыня. «Вырубаюць» маладыя людзі, якія кураць. Такіх трэба караць. Хвалюе таксама палітыка ўсіх краін, з-за якіх можа пачацца Трэцяя сусветная вайна».*

Вынікі можна зрабіць розныя: сёння інтэрнэт куды больш папулярны за кнігі, сябры даражэйшыя за сям'ю, няякасныя «шмоткі» хвалююць больш за законы, якія тычацца непасрэдна маладых.

Але ж не ўсе аднолькавыя. Некаторых хвалююць і больш глабальныя рэчы. Значыць, не ўсё так змрочна, праўда?

**Аляксандр СЕНЮЦЬ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о внесении изменений в эмиссионные документы по облигациям 105, 109, 111-117, 119-121, 130-141, 143-144 выпусков в связи с регистрацией нового места нахождения банка – 220089, г. Минск, проспект Дзержинского, 18.**

Указанные изменения зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 13.12.2012.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Логойского района Минской области 21 января 2013 года в 14.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документов | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Молоди, участок № 10, 623287605101000090 | 0,1923 | 3 618 035 | 11 538 000 | 2 307 600 |
| 2 | д. Молоди, участок № 18, 623287605101000104 | 0,1598 | 3 618 035 | 9 588 000 | 1 917 600 |
| 3 | д. Молоди, участок № 19, 623287605101000100 | 0,1500 | 3 618 035 | 9 000 000 | 1 800 000 |
| 4 | д. Молоди, участок № 20, 623287605101000101 | 0,1108 | 3 618 035 | 6 648 000 | 1 329 600 |
| 5 | д. Молоди, участок № 22, 623287605101000102 | 0,2005 | 3 618 035 | 12 030 000 | 2 406 000 |
| 6 | д. Молоди, участок № 23, 623287605101000103 | 0,1707 | 3 618 035 | 10 242 000 | 2 048 400 |
| 7 | д. Олешники, участок № 1, 623287600101000080 | 0,2028 | 3 639 035 | 12 168 000 | 2 433 600 |
| 8 | д. Олешники, участок № 2, 623287600101000081 | 0,2030 | 3 639 035 | 12 180 000 | 2 436 000 |

Задаток перечисляется на р/с 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО "АСБ Беларусбанк", код 601, г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **21 января 2013 года в 14.00 по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 14.00 15 января 2013 года.**

Контактные телефоны: **(8 01774) 59 1 35, 59 2 35, (8 029) 107 16 17.**

Наш сайт в интернете **logoysk.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 29.01.2013 г. в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского,19, конференц-зал.**

**Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**Лот 1.** Помещение 3-ого этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 27,9 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 6,975 базовой арендной величины; размер задатка – 0,6975 базовой арендной величины; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 2,0. Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» №85 от 5.05.2012 г., №151 от 08.08.2012 г.

**Лот 2.** Помещения 2-ого этажа здания, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. 14-я Полоцкая, 35А/1, удовлетворительного состояния, общей площадью 66,6 кв.м, (отдельные помещения: 11,5 кв.м, 21,5 кв.м, 14,0 кв.м, вспомогательное помещение – коридор – 19,6 кв.м), срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 16,65 базовой арендной величины; размер задатка – 1,67 базовой арендной величины; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 1,0. Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» №212 от 29.10.2010 г., №20 от 2.02.2011 г., №83 от 06.05.2011 г., №82 от 8.03.2012 г.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 21.12.2012 г. по 28.01.2013 г. в рабочее время (с 9.00 до 17.00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17.00 28.01.2013 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.**

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с №3012072841543 в филиале №200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

**Телефоны для справок: (0212) 27-29-42, 27-11-58, факс (0212) 27-18-81.
e-mail: kovalenko_ea@vitebsk.beltelecom.by**

## ОАО «МИНСКТОРГМАШ»

**объявляет о созыве внеочередного собрания акционеров 31 декабря 2012 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22, бухгалтерия общества**

**Повестка дня:**

1. Об отмене п.3 решения внеочередного общего собрания акционеров от 3 декабря 2012 г. Протокол № 23.
2. О ликвидации общества.

УНП 100103798

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## многоквартирный жилой дом, не относящийся к жилым домам повышенной комфортности, со встроенными помещениями и пристроенной заглубленной одноуровневой автостоянкой ПО ПР. ДЗЕРЖИНСКОГО – УЛ. ХМЕЛЕВСКОГО В Г. МИНСКЕ

### ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

**Застройщик** – закрытое акционерное общество «Инвест-Систем».

**Юридический (почтовый) адрес** – 220040, г. Минск, ул. Л. Беды, 8.

**Режим работы** – понедельник-четверг с 9.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.50.

ЗАО «Инвест-Систем» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 4 сентября 2000 года за № 100649060.

В течение трех предшествующих лет ЗАО «Инвест-Систем», как застройщиком, построены следующие объекты:

**в 2008 году:** 9-этажный, 128-квартирный ж/д со встроенными помещениями № 80 по пр. Дзержинского;

**в 2009 году:** 9-этажный, 35-квартирный ж/д № 3а по пр. Газеты «Правда»;

**в 2011 году:** 9-этажный 120-квартирный ж/д № 78 по пр. Дзержинского, 9-этажный 125-квартирный ж/д № 74 по пр. Дзержинского.

### ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Цель строительства – исполнение проекта по договору на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), заключенному с Минским горисполкомом 09.07.2008 г. Строительство жилого дома осуществляется в три этапа с выделением в пусковые комплексы. Сроки строительства жилого дома: октябрь 2009 года – май 2013 года.

По проектной документации получены заключения и согласования: комитета архитектуры и градостроительства Минского горисполкома (заключения № 10-15/139М от 15.10.2008 г. и №11-25/129М от 25.11.2009 г.); центра гигиены и эпидемиологии Московского района г. Минска (письмо № 33/2578 от 30.09.2008 г.); Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь (письмо № 1/04-02-09/191/смр от 25.05.2009 г.), РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключения № 3157-5/08 от 19.12.2008 г., № 2050-5/09 от 26.01.2010 г., № 309-15/11 от 23.05.2011 г.).

Жилой дом расположен в квартале пр. Дзержинского – ул. Хмелевского. Здание запроектировано с техподпольем и теплым техническим чердаком. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас. Наружные стены из ячеистого бетона с утеплителем. Межкомнатные перегородки – из ячеистого бетона. Кровля – плоская из рулонных материалов. Фундаменты свайные. Перекрытия – плоские монолитные. Каждая секция жилого дома оборудована пассажирским и грузовым лифтами, мусоропроводом.

Число этажей – 15 (1 секция) – 13 (6 секций) – 16 (1 секция), число секций – 8, количество квартир – 512, в том числе: однокомнатных – 179, двухкомнатных – 136, трехкомнатных – 191, четырехкомнатных – 6.

Общая площадь квартир в жилом доме – 33 241,35 кв.м. Жилые помещения без внутренней чистовой отделки.

На первом этаже располагается двадцать шесть административно-общественных помещений общей площадью 2967,6 кв.м., девятнадцать административно-офисных помещений общей площадью 1279,1 кв.м и одно помещение для размещения товарищества собственников общей площадью 53,0 кв.м. В жилом доме имеется заглубленная пристроенная одноуровневая автостоянка на 64 машино-места.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства физическим и юридическим лицам в **1 этапе III-го пускового комплекса** предлагается четыре административно-общественных (офисных) помещения по стоимости за 1 кв.м обшей площади в размере от 18 000 000 до 20 000 000 белорусских рублей.

Заявленные цены действительны до 31 января 2013 года.

Разрешение на строительство объекта и земельный участок под застройку предоставлены в соответствие с решениями Минского горисполкома от 21.12.2006 г. № 2563 (I), от 04.12.2008 г. № 2876, от 30.04.2009 г. № 945, от 29.10.2009 г. № 2556, а также актами выбора земельного участка от 08.02.2005 г., и от 24.09.2008 г., утвержденными председателем Минского горисполкома.

Проектом предусмотрено благоустройство прилегающей территории, устройство гостевой автостоянки, пешеходных тротуаров, озеленение путем посадки декоративных деревьев и кустарников, устройство газона.

После утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию 1-го этапа 111-го пускового комплекса дольщикам будут переданы указанные в настоящей проектной декларации административно-общественные (офисные) помещения.

Срок ввода в эксплуатацию строящегося объекта – май 2013 года.

Договоры строительного подряда от 25.09.2009 г. № 175 и от 10.02.2010 г. №175-1 заключены с ОАО «Строительный трест № 35», договор строительного подряда от 01.02.2011 г. № 25/13-11 заключен с ОАО «Строительный трест № 4».

**Ознакомление с планировкой и условиями оплаты, предлагаемых административных помещений, осуществляется в течение рабочего дня в офисе ЗАО «Инвест-Систем» по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 8, тел.: /8-017/ 202-10-67, 202-10-86, www.i-s.by**

Указанное в настоящей проектной декларации предложение считать действительным по 31.01.2013 г. либо до опубликования новой проектной декларации на данный объект.

SEX—БАЛЯСЫ

# КУДЫ ВОЧЫ ГЛЯДЗЯЦЬ

**Я ў шоку! Я, можна сказаць, нават раз'юшаны! Мой гнеў не мае межаў! Вядома, я падазраваў... Але каб да такой ступені падманваць?!. Гэта ў галаве не ўкладваецца, як так можна хлусіць... Вось скажыце мне, як цяпер з гэтым жыць?..**

**...Добра, я крыху супакоіўся, магу патлумачыць прычыну сваіх эмоцый. Патрапіла мне на вочы інфармацыя, што бюстгальтары не свайго памеру носяць... 70% жанчын. Пытаецеся, адкуль звесткі? Нейкія там даследаванні зноў былі, ці што. Ды якая розніца? Далей я ўжо і не чытаў, бо, як той казаў, працэс пайшоў. Гэта з той серыі, калі раўніваму сужэнцу нешта пачулася. Было ці не, а адказ трымаць давядзецца!**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Прабачце, дзяўчаты, вашы дробныя мілыя хітрыкі кшталту паралону-сілікону ў тых самых бюстгальтарах ніколі не былі для нас сакрэтам. Мы, як кажуць, прыхільна да іх ставіліся, не «заўважалі». Галоўнае, каб было ў меру і з густам. Іншая справа, што той густ месцамі адсутнічаў. Цалкам выкрывае вас лета, калі вопратка лёгкая і ўсё навідавоку. Ідзе, напрыклад, дзяўчына: грудзі «гарбузікамі» — суцэльны бюст! А ззаду шлейка ад бюстгальтара выпірае з-пад адзення ледзьве не пасярэдзіне лапатак. І што атрымліваецца? «Падцягнула» грудзі — насамрэч ніякія не «гарбузікі», а «яблычкі» — пад самы падбародак, выкарыстаўшы прадмет жаночага адзення на памер-другі меншы?..

Няхай гэта дробязі... Але — 70%! Выходзіць, што толькі ў трох з дзесяці дзяўчат, якіх ты сустрэў, — усё натуральна, без аніякага падману?.. Вось я і пытаюся: як цяпер з гэтым жыць?

...Ведаеце анекдот пра малітву дзяўчыны за абедзенным сталом? «Божа, калі ласка, зрабі так, каб усе калорыі пайшлі ў грудзі!» Не ўсе маюць тое, што хочуць. Але большасць жадае, і, як высветлілася, любым спосабам. Спецыяльнымі практыкаваннямі па павелічэнні і ўмацаванні займаецца не кожная, а вось вынік — дастань, як кажуць, і пакажы. Невыпадкова, напэўна, у «вясёлых і знаходлівых» нарадзіўся такі жарт: «У бландзінкі да 30 гадоў вырастаюць грудзі мудрасці...»

**«Дынькі», «гарбузікі», «грушкі», «апельсінкі», «персікі»... Які мужчынскі орган можа пахваліцца такой колькасцю прыгожых эпітэтаў?**

Грудзі — выключна жаночая частка цела, але — па сённяшнім часе — цалкам для... мужчын. Вядома, апроч выканання свайго прамога прыроднага прызначэння. У астатнім жанчыны свядома і мэтанакіравана выкарыстоўваюць свае выпукласці ў справе заваявання процілеглага полу, а той, у сваю чаргу, прызвычаіўся «весціся» на іх. «Класіка жанру», як ужо гаварыў, — лета! Вы ж прыгадайце, з якім гонарам у гэтую цёплую пару (усё ж навідавоку) нашы дзяўчаты нясуць... Ну, наша ўсё... А мы што? Нам падабаецца, мы не супраць: станеш у транспарце над чародкай такіх німфаў — вока ў выразах сукенак адпачывае...

Не спрачаюся, твар мае значэнне: вочы, вусны, скура, валасы, усмешка... А вы ведаеце, як мужчынскі погляд «скануе» жаночую фігуру? Ведаеце-ведаеце! Так, пачынаецца ўсё менавіта з твару, з вачэй. І калі яны спадабаліся, погляд пераходзіць на грудзі, потым — на жывот, сцёгны, ідзе ніжэй — да ног... Дык вось, твар толькі «ўключае сістэму»: «сканер» па-сапраўднаму пачынае «працаваць» (або не) менавіта з вашага выпуклага хараства. Што, думаеце, выпадкова нарадзіўся жарт (уявіце сабе пры гэтым дзяўчыну з пышным бюстам і з дэкальтэ): «У вочы глядзі! Я сказала — у вочы!»...

Якія выпукласці па форме і памерах нам падабаюцца? Калі гаварыць пра першае, тут адна толькі «агароднінна-садавінная» класіфікацыя чаго каштуе (падазраю, складзеная намі, мужчынамі)! «Дынькі», «гарбузікі», «грушкі», «апельсінкі», «персікі»... Які мужчынскі орган можа пахваліцца такой колькасцю прыгожых эпітэтаў? Памеры... Некаму падабаецца невялікі (як той казаў, каб у руцэ змяшчалася, а камусьці ў дзве далоні давай), хтосьці ў захапленні ад вельмі пышнага бюста.

Праўда, з апошнім трэба быць пільным, бо тут нядаўна выпадак быў... У Германіі 33-гадовая немка спрабавала задушыць свайго кавалера... уласным пышным бюстам. Пацярпелы потым расказваў следчым, што ў ложку сяброўка раптам схапіла яго галаву і з усёй моцы ўціснула ва ўласныя грудзі! Мужчына сказаў, што не мог дыхаць. Толькі нейкім цудам у яго атрымалася вырвацца з абдымкаў 82-кілаграмовай сяброўкі і збегчы ў дом да суседа (уяўляеце, як ён бег?). Арыштаваная сяброўка сказала ў паліцыі, што хацела падарыць свайму каханаму самую радасную смерць. А вось пацярпелы настойвае, што такім незвычайным чынам суайчынніца вырашыла расправіцца з ім за рашэнне спыніць стасункі. Уяўляеце сабе — грудзі-забойцы? Жудасць! А з іншага боку: трэба ж бачыць, каго кідаеш. Гэта я пра 82 кілаграмы. Як у тым анекдоце. «Вася хацеў бы кінуць сваю дзяўчыну. Але яго дзяўчына — чэмпіён горада па дзюдо і самба. Таму яна сама вырашае, каго і калі ёй кінуць». А ў небаракі зразумела куды вочы глядзелі... Але, будзем спадзявацца, той выпадак — выключэнне.

...А можа і нічога, што нас падманваюць, тыя самыя бюстгальтары на памер-другі меншыя носяць, паралон-сілікон выкарыстоўваюць? Калі разабрацца, дык для нас жа ў канчатковым выніку стараюцца! Нязручнасці церпяць цэлымі днямі... Ды і не падман гэта, напэўна. Проста прыгожае робіцца яшчэ прыгажэйшым... А нашы вочы — ну што тут зробіш? — туды толькі і глядзяць... Застаецца скончыць анекдотам. Зброя павінна захоўвацца ў кабуры. Таму жанчыны і носяць бюстгальтары.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

Цуды здараюцца!

# ХТО ЛЕПШЫЯ ДЗЕД МАРОЗ І СНЯГУРКА?

## ГЭТА ВЕДАЕ ТОЙ, ХТО НА СВЯЦЕ БЫЎ, КАРАГОДЫ ВАДЗІЎ

**Хто сказаў, што ёсць толькі адзін Дзед Мароз і толькі адна Снягурка? Гэты «хтосьці», відаць, нешта пераблытаў! Гледачы конкурснай праграмы «Ёлка-Фэст-2012» лёгка могуць тую думку аспрэчыць: яны на свае вочы ўбачылі і пазнаёміліся амаль з дваццаццю парамі самых чаканых для ўсіх дзяцей гасцей на Новы год.**

### ШТО ТАКОЕ «ЁЛКА-ФЭСТ»?

Гэта рэспубліканскі конкурс Дзедаў Марозаў і Снягурак, які праходзіць у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ўжо чацвёрты раз. Каб стаць яго ўдзельнікам, неабходна стаць лепшымі ў сваім раёне, затым у вобласці. Пераможцы адпраўляюцца на заключны этап у Мінск.

Дарэчы, да ўдзелу былі запрошаны толькі тыя, хто мае дачыненне да працы ў школе або ўстанове дадатковай адукацыі і выхавання моладзі. Усяго было заяўлена 20 пар канкурсантаў, але, на жаль, некалькі Дзедаў Марозаў і Снягурак не даехалі: відаць, не хапіла часу ў пераднавагоднюю пару.







### МАРОЗЫ І СНЯГУРКІ: УСЕ ТАКІЯ РОЗНЫЯ

Нехта прыехаў у традыцыйным доўгім «дзедмарозаўскім» футры, нехта — ва ўборы, пашытым на старадаўні манер. А яшчэ быў адзін Дзед Мароз, які вырашыў «зламаць» стэрэатып пра тое, што яго персанаж — стары і з доўгай барадой. Так, маладзечанскі ўдзельнік аказаўся зусім не старым і барада яго была — ну так, адна назва — але затое як ён танцуе! Сапраўды, нестандартны Мароз, амаль як у брадвейскім мюзікле.

**Маладзечанскі ўдзельнік аказаўся зусім не старым і барада яго была — ну так, адна назва — але затое як ён танцуе! Сапраўды, нестандартны Мароз, амаль як у брадвейскім мюзікле.**

Снягуркі таксама былі, што называецца, не на адзін твар. Адны — сапраўдныя дзяўчынкі-свавольніцы, у кароценькіх сукеначках са сняжынкамі і футрай, другія — у доўгіх футрах. Была нават зусім яшчэ маленькая Снягурачка з Гродна — Яна Цяслюк, якая наведвае гурток «Сцэнічнае майстэрства». Дарэчы, Яна і яе спадарожнік Дзед Мароз (Аляксей Садоўскі) атрымалі першае месца ў намінацыі «Лепшая сюжэтна-гульнявая праграма».

У звычайным жыцці Марозы і Снягуркі працуюць настаўнікамі, акампаніятарамі, харэографамі, рэжысёрамі, культарганізатарамі... Затое ў гэты казачны перадсвяточны час яны дораць дзецям цуд. Снягурка **Валерыя Новікава, выкладчык харэаграфіі ў 8-й гімназіі Віцебска,** расказала пра свой удзел у «Ёлка-Фэсце»:

*— На рэспубліканскі этап выйшлі ўпершыню, але ў самім конкурсе я ўжо ўдзельнічала — тады дайшлі толькі да «вобласці». Амплуа Снягуркі мне падабаецца асабліва, бо яна дорыць людзям шчасце. Але мала палюбіць свайго персанажа. Каб стаць добрай Снягуркай, трэба ўмець наладзіць кантакт з дзецьмі, зрабіць нумар яркім, стаць сапраўдным дуэтам з Дзедам Марозам. Да ўдзелу ў конкурсе мы рыхтаваліся дзесьці паўмесяца, нам дапамагалі як у школе, так і ў тэатральным цэнтры.*

### ЖЫВЫЯ ВАЛЁНКІ І БЯСПЕЧНАЯ ПІРАТЭХНІКА

Каб паказаць, хто больш за іншых годны атрымаць тытул лепшага ў краіне Дзеда Мароза і Снягуркі, удзельнікі павінны былі падрыхтаваць і выканаць свой невялікі конкурсны нумар. Дарэчы, ацэньвала іх не толькі журы, але і аўдыторыя, якая складалася з маленькіх гледачоў.

Мароз і Снягурка з Бабруйска прапанавалі гледачам гульню «Чароўны мяч». Дзеці па чарзе перадавалі мяч з рук у рукі. У каго ён аказваўся, той павінен быў выканаць жаданне Снягуркі.

Казачныя канкурсанты Анатоль Сахоўскі і Алена Шайко з пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці зладзілі сапраўдны феерверк. Ды такі, што супрацоўнікам пажарнай бяспекі не было да чаго прычапіцца: частка гледачоў павінна была біць у ладкі, другая частка — тупаць нагамі і, нарэшце, трэцяя — крычаць «ура!». Вось такая бяспечная піратэхніка. Дарэчы, гэтая пара атрымала другое месца ў намінацыі «Лепшы Дзед Мароз і Снягурка».

А вось Дзед Мароз з Петрыкава Аляксандр Чычыкайла меў праблемы з валёнкамі. Снягурка Юлія Кулак не ведала, як і дапамагчы. Спачатку стары абуўся ў хатнія тапачкі, а пасля прыйшлі валёнкі-самаходы... памерам з чалавека. На шчасце, праблему вырашылі, а «жывыя» валёнкі пацешылі дзяцей танцам. Канкурсанты з Петрыкава атрымалі другое месца ў намінацыі «Лепшая сюжэтна-гульнявая праграма».

**Дзед Мароз Дзяніс Патыканы і Снягурка Таццяна з пінскай гімназіі №18** атрымалі першае месца ў намінацыі «Лепшы Дзед Мароз і Снягурка». Прынамсі, не апошнюю ролю тут адыграла іх казачная інсцэніроўка пра каралеўства крывых люстэркаў.

**Супрацоўнікам пажарнай бяспекі не было да чаго прычапіцца: частка гледачоў павінна была біць у ладкі, другая частка — тупаць нагамі і, нарэшце, трэцяя — крычаць «ура!». Вось такая бяспечная піратэхніка.**

*— Да гэтага Дзедам Марозам даводзілася быць на школьных святах, — прызнаецца настаўнік працоўнага навучання Дзяніс Патыканы. — У конкурсе «Ёлка-Фэст» удзельнічаю, лічыце, выпадкова. Запрасілі на гэтую ролю, і не змог адмовіцца. Усё ж такі ўспаміны пра шчаслівае дзяцінства застаюцца з намі на ўсё жыццё, таму хочацца зрабіць калядныя святы для дзетак сапраўды вясёлымі.*

...Конкурс быў доўгім, і кожная пара імкнулася заявіць пра сябе ярка і запамінальна. Хтосьці стаў пераможцам, у некага не атрымалася, але галоўнае — гэта тая радасць, якую падарылі Дзяды Марозы і Снягуркі сваім маленькім гледачам. А яе, радасці, было шмат, калі меркаваць па шумных апладысментах, смеху і вясёлым крыку з залы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.325.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.12.2012 г.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 36 (458)

## ЗІМОВЫ АГАРОД НА АКНЕ

Для раслін, як вядома, неабходны святло, цяпло, вада і сілкаванне. Калі гэтыя асноўныя фактары будуць забяспечаны, то вы атрымаеце ўраджай. У зімовы час дні кароткія і сонейка мала. Гэта і будзе абмежавальным фактарам развіцця раслін. Недахоп святла можна кампенсаваць дадатковым асвятленнем, хоць бы лямпамі дзённага святла па 4-8 гадзін у дзень. Але гэта дорага, і не кожны можа сабе дазволіць такую раскошу. Аднак, нягледзячы на ўсе цяжкасці, узімку ўсё ж можна мець вітамінавую зеляніну, атрыманую ад выганкі пятрушкі, цыбулі, сельдэрэю, мангольду, буракоў, салатнай цыкорыі, катрана, меліс, эстрагону, шчаўя.

